А. Л. Давідовіч, А. І. Смолер

ВМК «Мае першыя ўрокі»

# СВЕТ, У ЯКІМ Я ЖЫВУ



ВМК «Мае першыя ўрокі»

А. Л. Давідовіч, А. І. Смолер

# СВЕТ, У ЯКІМ Я ЖЫВУ

Вучэбна-метадычны дапаможнік
для педагагічных работнікаў устаноў адукацыі,
якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай
адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання

*Рэкамендавана*
*дзяржаўнай установай адукацыі*
*«Акадэмія адукацыі»*

2-е выданне, перагледжанае і дапоўненае

МІНСК
Акадэмія адукацыі
2025

УДК 373.2.015.031
ББК 74.100.5
Д13

Серыя заснавана ў 2019 годзе

Р э ц э н з е н т
загадчык дзяржаўнай установы адукацыі
«Дзіцячы сад № 397 г. Мінска» *Н. Я. Шыцікава*

**Давідовіч, А. Л.**
Д13 Свет, у якім я жыву : вучэб.-метад. дапаможнік для пед. работнікаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграму дашкольнай адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання / А. Л. Давідовіч, А. І. Смолер. — 2-е выд., перагледж. і дап. — Мінск : Акадэмія адукацыі, 2025. — 216 с. — (ВМК «Мае першыя ўрокі»).
ISBN 978-985-33-0287-5.

Вучэбна-метадычны дапаможнік уваходзіць у ВМК «Свет, у якім я жыву», які з'яўляецца складанай часткай ВМК «Мае першыя ўрокі». Змест накіраваны на рэалізацыю адукацыйнай галіны «Дзіця і грамадства» вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі. Даюцца метадычныя рэкамендацыі па рэалізацыі задач згаданай галіны, прапанаваны канспекты заняткаў з выхаванцамі ад 5 да 7 гадоў.

Адрасуецца педагагічным работнікам устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання.

**УДК 373.2.015.031**
**ББК 74.100.5**

**ISBN 978-985-33-0287-5**

© Давідовіч А. Л., Смолер А. І., 2020
© Давідовіч А. Л., Смолер А. І., 2025, са змяненнямі
© Афармленне. ДУА «Акадэмія адукацыі», 2025

## АД АЎТАРАЎ

Вучэбна-метадычны комплекс «Свет, у якім я жыву» з'яўляецца складанай часткай ВМК «Мае першыя ўрокі» і арыентаваны на назапашванне вопыту пазнання сацыяльнай рэчаіснасці і рукатворнага свету дзецьмі ад 5 да 7 гадоў. Матэрыял, размешчаны ў вучэбна-метадычным комплексе, дае выхавальніку дашкольнай адукацыі магчымасць развіваць у выхаванцаў цікавасць да традыцый і каштоўнасцей нацыянальнай культуры, аб'ектаў рукатворнага свету, фарміраваць у іх уменне выкарыстоўваць у сваёй жыццядзейнасці найпрасцейшыя эканамічныя паняцці, пашыраць уяўленні пра асаблівасці ўзаемадзеяння ў соцыуме.

Змест вучэбна-метадычнага комплексу пабудаваны з улікам розных тэмпаў і ўзроўняў развіцця выхаванцаў, спалучэння і паступовага змянення суадносін рэпрадуктыўнай і прадуктыўнай дзейнасці, пазіцый навучальнага і развіваючага характару. Таксама ўлічана магчымасць даваць дзецям шырокі выбар відаў дзейнасці. Такі падыход стварае ўмовы для паступовага азнаямлення выхаванцаў згаданай узроставай катэгорыі з асаблівасцямі навакольнага свету. У дзяцей фарміруюцца псіхалагічная гатоўнасць да сумесных дзеянняў, патрэбнасць у бяспечным і здаровым ладзе жыцця, развіваецца здольнасць прадбачыць вынік сваіх паводзін, адэкватна рэагаваць на розныя сітуацыі, авалодваць тым ці іншым відам дзейнасці па ўласнай ініцыятыве (без дапамогі дарослых).

Вучэбна-метадычны комплекс «Свет, у якім я жыву» складаецца з вучэбна-метадычнага дапаможніка для педагагічных работнікаў устаноў дашкольнай адукацыі, вучэбнага нагляднага дапаможніка для ўстаноў дашкольнай адукацыі і вучэбнага дапаможніка (рабочага сшытка) для выхаванцаў старшых груп.

У ***вучэбна-метадычным дапаможніку*** коратка апісана методыка арганізацыі навучання ва ўстанове дашкольнай

адукацыі. Прапаноўваюцца канспекты спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу ва ўстанове дашкольнай адукацыі на навучальны год у адпаведнасці са зместам вучэбнага нагляднага дапаможніка і вучэбнага дапаможніка (рабочага сшытка). Спецыяльна арганізаваныя формы адукацыйнага працэсу пададзены 8 блокамі: «Мы — беларусы», «Беларусь — дружалюбная краіна», «Нашы святы», «Мая сям'я, сямейная эканоміка», «Я і іншыя людзі», «Мая бяспека», «Прадметы вакол нас», «Пазнаём свет прафесій». Канспекты змяшчаюць праграмныя задачы, пералік матэрыялаў, неабходных для правядзення заняткаў, падрабязнае апісанне ходу заняткаў. Канспект кожных заняткаў распрацаваны для дзвюх узроставых катэгорый дзяцей, заданні для выхаванцаў ад 6 да 7 гадоў пазначаны зорачкай (*). Колькасць спецыяльна арганізаваных форм навучання вар'іруецца з разліку не больш за 8 заняткаў на месяц.

***Вучэбны наглядны дапаможнік*** змяшчае дэманстрацыйны дыдактычны матэрыял. Ілюстрацыі дапамагаюць раскрыць сутнасць матэрыялу, які вывучаецца, развіць у дзяцей канцэнтрацыю ўвагі, стымулююць пазнавальную актыўнасць, што дае магчымасць павысіць якасць і эфектыўнасць навучання.

***У вучэбным дапаможніку (рабочым сшытку)*** сабраны творчыя заданні, якія выхаванцы могуць выконваць разам з дарослымі. Змест вучэбнага дапаможніка пабудаваны ў адпаведнасці з задачамі заняткаў і ілюстрацыйным матэрыялам да іх. У рабочым сшытку размешчаны малюнкі, схемы і графічныя заданні (чорна-белыя выявы).

У канспектах заняткаў прыняты наступныя ўмоўныя абазначэнні:

 — работа з вучэбным наглядным дапаможнікам (пазначаны нумары лістоў);

 — работа ў сшытку (пазначаны нумары старонак).

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ

Змест вучэбна-метадычнага комплексу «Свет, у якім я жыву» забяспечвае рэалізацыю адукацыйнай галіны «Дзіця і грамадства» вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі для старшай групы (выхаванцы ад 5 да 7 гадоў).

Са зместам адукацыйнай галіны выхаванцы знаёмяцца перш за ўсё ў спецыяльна арганізаванай дзейнасці — падчас заняткаў. Тэму заняткаў (з пералічаных блокаў) і форму іх правядзення выхавальнік дашкольнай адукацыі (далей — выхавальнік) вызначае самастойна, зыходзячы з адукацыйных задач, якія яму неабходна вырашыць, і тэматычнага планавання. Напрыклад, першыя заняткі па адукацыйнай галіне «Дзіця і грамадства» можна правесці з апорай на канспект № 27 (блок 3 «Нашы святы»: заняткі прысвечаны агульнарэспубліканскаму Дню ведаў (1 верасня)). Пры гэтым улічваюцца ўзровень развіцця дзяцей і арганізацыя нерэгламентаванай дзіцячай дзейнасці (назіранні, наведванне выставак, дзіцячае эксперыментаванне і інш.).

Да працэсу пазнання трэба далучаць усіх выхаванцаў. Рэкамендуецца даваць дзецям магчымасць рэфлексаваць наконт таго, што яны ведаюць і думаюць. Дзеля забеспячэння *развіваючага эфекту* заняткаў неабходна:

- фарміраваць у выхаванцаў уменні задаваць пытанні і адэкватна рэагаваць на памылкі (свае і аднагодак);
- параўноўваць вынікі дзеянняў дзіцяці на занятках толькі з яго ўласнымі вынікамі;
- фарміраваць навыкі культурных паводзін на занятках (размаўляць нягучна, звяртацца па справе);
- развіваць пачуццё часу.

Акрамя праграмных задач і матэрыялу канспекты змяшчаюць меркаваныя адказы дзяцей, якія з'яўляюцца арыенцірамі для выхавальніка падчас правядзення заняткаў. Між тым іх наяўнасць не выключае творчага падыходу да арганізацыі работы.

У канспекты не ўключаны абыгрыванне пачатку заняткаў, фізкультхвілінка і падвядзенне вынікаў. Прадугледжваецца, што выхавальнік будзе прытрымлівацца агульнапрызнанай у дашкольнай дыдактыцы структуры правядзення заняткаў, што дасць яму магчымасць праявіць свае прафесійныя кампетэнцыі.

Падрыхтоўка да заняткаў прадугледжвае адбор метадаў актывізацыі пазнавальнай цікавасці выхаванцаў і ўздзеяння на іх уражанні, а таксама прадумванне арганізацыі калектыўнай і індывідуальнай дзейнасці. Для актывізацыі разумовай дзейнасці мэтазгодна выкарыстоўваць праблемныя і эўрыстычныя метады навучання, сутнасць якіх заключаецца ў тым, каб не даваць дзецям гатовых адказаў, а заахвочваць думаць, разважаць, самастойна шукаць рашэнне. Пры гэтым дзіця вучыцца арыентавацца ў навакольнай рэчаіснасці, праяўляць ініцыятыву, выказваць уласную пазіцыю і прымаць чужую. Такім чынам яно расце, развіваецца, рэалізуючы свой творчы патэнцыял.

У межах нерэгламентаванай дзейнасці, заняткаў (гульняў) па адукацыйнай галіне «Мастацкая літаратура» рэкамендуецца папярэдне азнаёміць выхаванцаў з літаратурнымі творамі, якія мяркуецца аналізаваць у далейшым.

Асобнае месца адводзіцца дыдактычнай гульні, якая тэматычна звязана з прадметамі, што вывучаюцца, і з'явамі навакольнай рэчаіснасці. Дыдактычная гульня актывізуе ўсе псіхічныя працэсы дзіцяці, развівае маўленне, камунікатыўныя ўменні, пры неабходнасці суправаджаецца рухальнымі дзеяннямі. Заняткі арганізоўваюцца ў атмасферы добразычлівасці і падтрымкі на аснове пастаяннага ўзаемадзеяння (удзельнікі знаходзяцца ў рэжыме бесперапыннага дыялогу, гутаркі). Неабходна заахвочваць і падтрымліваць выхаванцаў на працягу ўсёй гульні, асабліва гэта важна ў адносінах да пасіўных, няўпэўненых у сабе дзяцей.

Методыка правядзення заняткаў будуецца на выкарыстанні дэманстрацыйнага дыдактычнага матэрыялу, паколькі дзеці лепш успрымаюць візуальную інфармацыю. Акрамя

таго, ілюстрацыі дазваляюць дэманстраваць такія аб'екты і з'явы, якія цяжка ўбачыць у штодзённым жыцці.

Асобныя лісты дэманстрацыйнага матэрыялу могуць быць выкарыстаны ў нерэгламентаванай дзейнасці, што будзе садзейнічаць развіццю ў дзяцей навыкаў самастойнага паўтарэння, замацаванню атрыманых ведаў і выкарыстанню іх у новых абставінах.

Працуючы з вучэбным дапаможнікам (рабочым сшыткам), выхаванцы замацоўваюць атрыманыя веды, сістэматызуюць, паглыбляюць і пашыраюць іх, а таксама развіваюць дробную маторыку рук. Работа з вучэбным дапаможнікам можа разглядацца як варыянт падвядзення выніку заняткаў.

Выхавальніку адводзіцца вядучая роля ў арганізацыі работы з вучэбным наглядным дапаможнікам і вучэбным дапаможнікам (рабочым сшыткам). Ён прапаноўвае дзецям выконваць розныя заданні і практыкаванні на нагляднай і вуснай аснове, тлумачыць заданні, праводзіць гутаркі, арганізоўвае самастойнае выкананне практыкаванняў, выступае ў ролі партнёра ў сумеснай дзейнасці і зносінах.

***Гульня «Цудоўны школьны рукзачок»**

Выхавальнік прапаноўвае дзецям па чарзе вызначыць навобмацак школьную прыладу, якая ляжыць у рукзачку *(ручка, аловак, ласцік, пенал, сшытак, кніга, пэндзаль, тачылка, лінейка, вокладка для кніг)*, назваць гэты прадмет і паказаць. Калі прадмет адгаданы дакладна, ён застаецца ў дзіцяці.

***Гульня «Закончы прыказку»**

Выхавальнік прапаноўвае дзецям закончыць прыказкі пра важнасць вучобы.

1. Вучэнне — святло, а невуцтва — ... *(цемра)*.
2. Не сорамна не ведаць, сорамна... *(не вучыцца)*.
3. Век жыві — век... *(вучыся)*.
4. Не крычы, а лепш... *(навучы)*.
5. Вучэнне — шлях да... *(умення)*.
6. Вучыцца ніколі... *(не позна)*.
7. Не той шмат ведае, хто доўга жыў, а той, хто шмат... *(вучыўся)*.
8. У каго веды, у таго і... *(сіла)*.

*Выхавальнік прапаноўвае дзецям намаляваць калектыўны малюнак «Я іду ў школу» (дзеці малююць на вялікім лісце паперы, як яны ідуць у школу).

# Блок 4. Мая сям'я, сямейная эканоміка

## Заняткі 28

### МАЕ СВАЯКІ

***Задачы:***

- фарміраваць усведамленне сваёй прыналежнасці да сям'і; уяўленні пра склад сям'і, сваякоў (бацька, маці, бабулі і дзядулі, браты і сёстры, дзядзькі і цёткі), родасныя сувязі, залежнасці ўнутры сям'і, прафесіі і заняткі бацькоў і сваякоў; уменне расказваць з дапамогай дарослага пра сваю сям'ю; закладваць асновы мараль-

ных каштоўнасцей: фарміраваць уяўленні пра паняцці «дружба», «справядлівасць», «працавітасць» і інш.;

- *развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго ўнутранага свету; фарміраваць уяўленні пра склад сям'і, сваю прыналежнасць да яе, прафесіі, інтарэсы і заняткі бацькоў і сваякоў, імёны і імёны па бацьку бацькоў і блізкіх сваякоў; вучыць культуры зносін у сям'і, праяўляць з дапамогай дарослага і самастойна клопат пра членаў сям'і; самастойна вызначаць і называць эмацыянальны стан аднагодак і дарослых; выхоўваць імкненне да ўзаемаразумення і суперажывання членам сям'і.

***Матэрыял:***

- вучэбны наглядны дапаможнік (ліст 50); рабочы сшытак (с. 35); «далонька»;
- *рабочы сшытак (с. 35); «далонька».

## ХОД ЗАНЯТКАЎ

Выхавальнік чытае дзецям верш Н. Галіноўскай «Сямейны хор» [17]:

У нас вялікая сям'я:
Бабуля, мама, тата, я
І два старэйшыя браты.
Сястрыцы дзве. Прыходзь і ты.
У выхадны, у вольны час
Цікава, весела ў нас:
Спявае наш сямейны хор.
Свой музыкант, свой дырыжор.
Саліст у нас таксама ёсць.
Прыходзь, жаданы будзеш госць.

— Ці ўсе героі верша з'яўляюцца адной сям'ёй? Пералічыце іх. *(Бабуля, мама, тата, сёстры, браты.)*

50 Выхавальнік паказвае малюнак сям'і:

— Назавіце ўсіх членаў сям'і на малюнку. У кожнага чалавека ёсць сваякі: тата, маці, браты, сёстры, бабулі, дзядулі. Іх усіх можна назваць словам «сям'я». Зараз мы будзем перадаваць адно аднаму «далоньку» і расказваць пра сваю сям'ю («Колькі чалавек у сям'і?», «Як завуць членаў сям'і?», «Якімі ласкавымі словамі ты іх называеш?»).

— Закончыце сказы:

1. Калі я табе дачка, то ты мне... *(мама ці тата)*.

2. Калі я табе пляменніца, то ты мне... *(цётка ці дзядзька)*.

3. Калі я табе ўнук, то ты мне... *(бабуля ці дзядуля)*.

4. Калі я табе прадзед, то ты мне... *(праўнучка ці праўнук)*.

5. Калі я табе брат, то ты мне... *(сястра ці брат)*.

6. Калі я табе дзядзька, то ты мне... *(пляменнік ці пляменніца)*.

7. Калі я табе бабуля, то ты мне... *(унук ці ўнучка)*.

8. Калі я табе тата, то ты мне... *(сын ці дачка)*.

— Вы будзеце перадаваць адно аднаму «далоньку» і расказваць, як вы адпачываеце разам са сваёй сям'ёй, чым любіце займацца. А зараз вы будзеце перадаваць адно аднаму «далоньку» і называць прадметы, якія патрэбны бацьку, маці.

Намалюйце ў авалах твары самых блізкіх вам людзей.

35

*В.: Што робяць усе ў дружнай сям'і? *(Дапамагаюць адно аднаму.)*

— Я раскажу вам пра тое, як хлопчык Васілёк дапамагае дома сваёй сям'і. Уважліва слухайце. Калі вы робіце тое ж самае, тупайце нагамі і гаварыце: «Я раблю гэтак жа».

1. Васілёк засцілае ложак.
2. Васілёк дапамагае бацькам гатаваць вячэру.
3. Васілёк палівае расліны.
4. Васілёк корміць хатніх гадаванцаў.
5. Васілёк прыводзіць у парадак свае цацкі (рэчы).
6. Васілёк дапамагае малодшым братам і сёстрам.

— Як вы думаеце, навошта Васілёк робіць усё гэта? *(Ён выконвае хатнія абавязкі, каб дома быў парадак.)* Што было б, калі б ніхто не выконваў свае хатнія абавязкі?

***Гульня «Як я дапамагаю»**

Дзеці перадаюць адно аднаму «далоньку», расказваюць, як дапамагаюць у сям'і, і паказваюць гэта дзеяннямі.

35 *Намалюйце свой графік дапамогі дома на працягу тыдня (схему дзеянняў у выглядзе значкоў).

— Такія значкі ўяўляюць сабой выяву, якая звязана з канкрэтным дзеяннем. Мы з вамі прыдумаем іх. Напрыклад, «паліваю кветку» — малюнак кветкі; «праціраю пыл» — прамавугольнік чырвонага колеру; «гуляю з сабакам» — малюнак пыскі сабакі і г. д.

35 — А зараз вам самім трэба прыдумаць 7 значкоў для схемы дзеянняў, намаляваць іх і расказаць, як вы дапамагаеце дома.

## Заняткі 29

### ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ Ў СЯМ'І

***Задачы:***

- фарміраваць уяўленне пра свае правы і абавязкі ў сям'і, уменне ўсведамляць сябе членам сям'і; фарміраваць уяўленне пра сваю сям'ю (значэнне сям'і ў жыцці чалавека, сямейныя будні і святы, традыцыі, сумесны адпачынак), блізкіх сваякоў, іх заняткі; выхоўваць маральныя і эстэтычныя пачуцці, жаданне актыўна ўдзельнічаць у жыцці сваёй сям'і;
- *развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго ўнутранага свету; фарміраваць уяўленні пра сябе як члена сям'і, пра блізкіх сваякоў, іх заняткі, сямейную эканоміку; вучыць спосабам культуры зносін у сям'і; фарміраваць уменне самастойна праяўляць клопат пра членаў сям'і, вызначаць і называць эмацыянальны стан аднагодак і дарослых; выхоўваць каштоўнаснае стаўленне да сямейных традыцый.

***Матэрыял:***

- вучэбны наглядны дапаможнік (ліст 51); рабочы сшытак (с. 36); мяч; «далонька»;
- *рабочы сшытак (с. 36).

ХОД ЗАНЯТКАЎ

**В.:** Якія бываюць сем'і? Сапраўды, ёсць маленькія сем'і, ёсць вялікія. Важна, каб у сям'і панавалі мір і згода. Павага і любоў праяўляюцца ва ўзаемным клопаце, у цёплых словах і добрых справах у адносінах да сваіх блізкіх. Як бацькі клапоцяцца пра вас? Што яны робяць?

51 Выхавальнік паказвае дзецям ілюстрацыі, на якіх паказаны заняткі членаў сям'і:

— Паглядзіце на малюнкі і раскажыце, хто чым займаецца. *(Дзядуля збірае яблыкі, бабуля варыць суп, дзеці збіраюць цацкі, маці прасуе бялізну, тата рамантуе крэсла.)* Навошта дзецям і дарослым трэба выконваць хатнюю работу? *(Каб дома было ўтульна.)*

**Гульня «Як я дапамагаю сваім бацькам»**

Дзеці ўтвараюць кола. Выхавальнік стаіць у цэнтры і кідае выхаванцам па чарзе мяч. Дзеці ловяць мяч і расказваюць, як яны дапамагаюць бацькам.

**В.:** Для таго каб задавальняць патрэбнасці сям'і, дарослыя члены сям'і працуюць. У кожнага свая прафесія. Зараз вы будзеце перадаваць адно аднаму «далоньку» і расказваць аб прафесіях сваіх бацькоў. (Прапаноўваецца план: «Дзе працуюць бацькі?», «Вы калі-небудзь былі ў іх на працы?», «Што вы там бачылі?», «Навошта бацькам трэба працаваць?».) Бацькі працуюць не толькі для таго, каб зарабляць грошы на патрэбнасці сям'і; іх праца патрэбна ўсім людзям.

**Гульня «Адгадай эмоцыю і пакажы яе»**

Дзеці і выхавальнік садзяцца ў кола. Педагог паказвае эмоцыю на твары, дзеці паўтараюць за ім, паказваюць эмоцыю адно аднаму па парадку і называюць яе *(шчасце, здзіўленне, злосць)*.

**Гульня «Падумай і адкажы, што было б...»**

— Як вы думаеце, што б здарылася, калі б раптам не стала міліцыі?

— Як вы думаеце, як бы мы жылі, калі б не было работнікаў сельскай гаспадаркі (трактарыстаў, даярак, пчаляроў)?

— Як вы думаеце, што б адбылося, калі б зніклі пажарныя?

— Як вы думаеце, як бы мы жылі, калі б не было лекараў?

36 Разгледзьце выявы. Назавіце лішні прадмет у кожным радзе. Чаму вы так думаеце? Абвядзіце лішні прадмет алоўкам чырвонага колеру.

***Гульня «Адгадай эмоцыю і пакажы яе»**

Дзеці і выхавальнік садзяцца ў кола. Педагог паказвае на твары эмоцыю, дзеці паўтараюць за ім, паказваюць эмоцыю адно аднаму па парадку і называюць яе *(злосць, сум, спалох, шчасце, здзіўленне, стомленасць)*.

***В.:** Члены нашых сем'яў гэтак жа, як і мы, адчуваюць розныя эмоцыі. Зараз я буду апісваць розныя сітуацыі з удзелам членаў сям'і, а вам трэба будзе паказаць (зрабіць адпаведны выраз твару), што адчувае ваш блізкі чалавек.

1. Мама ўбачыла разбітую талерку.
2. Брату падарылі новую цацку.
3. Сястра забылася, куды яна паклала сваю ляльку.
4. Тата прыйшоў з працы. Ён стаміўся.
5. Бабуля захварэла і ляжыць у ложку.

— Прывядзіце прыклады, як сваімі ўчынкамі вы раззлавалі або засмуцілі каго-небудзь. Як вы сябе адчувалі пасля гэтага? Якія пачуцці выклікаў ваш учынак у членаў сям'і? Як вы ўсё выправілі?

36 *Намалюйце тое, што магло б зрабіць вас шчаслівым. Раскажыце пра гэта.

## Заняткі 30

### РАДАВОД СЯМ'І

***Задачы:***

- развіваць сацыяльныя і пазнавальныя матывы; фарміраваць уяўленні пра свае правы і абавязкі ў сям'і,

уменне ўсведамляць сябе членам сям'і; фарміраваць уяўленне пра сваю сям'ю (значэнне сям'і ў жыцці чалавека, радавод, герб сям'і, сямейныя будні і святы, традыцыі, сумесны адпачынак), маральныя і эстэтычныя пачуцці, жаданне актыўна ўдзельнічаць у жыцці сям'і;
- *развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго ўнутранага свету і ўнутранага свету членаў сям'і; фарміраваць уменне ўсведамляць сябе суб'ектам дзейнасці, праяўляць спагаду, імкненне аказваць эмацыянальную падтрымку, дапамогу членам сям'і; выхоўваць каштоўнаснае стаўленне да сямейных традыцый.

***Матэрыял:***
- рабочы сшытак (с. 37); фотаздымкі дзяцей з членамі іх сям'і;
- *дзіцячыя рэчы; цацкі, у якія гулялі бацькі выхаванцаў.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ

**В.:** Сёння ў нас адкрылася выстава вашых сямейных фотаздымкаў. Нам будзе цікава паслухаць расказы пра вашы сем'і. *(Дзеці расказваюць.)* Што вы адчуваеце, калі расказваеце пра сваю сям'ю? *(Радасць, гордасць, шчасце.)* Чаму? *(Таму што я люблю сваю сям'ю, а мая сям'я любіць мяне.)*

### Гульня «Падскокваем, у каго ёсць...»

Дзеці становяцца ў кола, педагог пачынае:
— Падскокваюць тыя, у каго ёсць бабуля.
— Падскокваюць тыя, у каго ёсць сястра.
— Падскокваюць тыя, у каго ёсць дзядуля.
— Падскокваюць тыя, у каго ёсць брат.
— Падскокваюць тыя, у каго ёсць цётка.
— Падскокваюць тыя, у каго ёсць прабабка.
— Падскокваюць тыя, у каго ёсць дзядзька.
— Падскокваюць тыя, у каго ёсць прадзед.

**В.:** Як яшчэ можна назваць сям'ю? *(Сваякі.)* Сваякамі называюць людзей, блізкіх па сваяцтве. Што азначае слова

«род»? *(Гэта ўсе сваякі: маці, бацька, сёстры, браты, цёткі, дзядзькі, бабулі, дзядулі.)* Род — гэта адна вялікая сям'я. Яго можна паказаць у выглядзе дрэва (генеалагічнага дрэва).

37 Разгледзьце генеалагічнае дрэва і намалюйце на ім сваю сям'ю. Ствол дрэва — гэта дзіця; вялікія галінкі — маці і тата; тонкія галінкі, якія ідуць ад галін маці і таты, — бабулі і дзядулі.

*Выхавальнік прапаноўвае дзецям паказаць рэчы іх бацькоў, якімі тыя карысталіся ў дзяцінстве (рэчы дзеці загадзя прыносяць з дому).

— Вашы мамы і таты таксама былі маленькімі, і ў іх былі любімыя цацкі і рэчы. Што вашы бацькі расказвалі пра гэта?

— Што вы ведаеце пра немаўлят? (Прапаноўваецца план: «Што робяць немаўляты?», «У чым яны маюць патрэбу?», «Ці могуць немаўляты жыць адны?».) Я зараз прапаную сцвярджэнні. Калі вы будзеце згодны з імі, пляснiце ў далоні.

1. Немаўляты маюць патрэбу ў малацэ.
2. Немаўляты маюць патрэбу ў кока-коле.
3. Немаўлятам патрэбен шакалад.
4. Немаўляты маюць патрэбу ў клапатлівых бацьках.
5. Немаўляты могуць спаць адны на вуліцы.
6. Усе дзеці таксама маюць патрэбу ў тым, у чым маюць патрэбу немаўляты.

— Сапраўды, не толькі немаўлятам, але і ўсім дзецям патрэбна сям'я, якая клапоціцца пра іх, забяспечвае іх патрэбнасці, дае ім любоў і ўвагу. Прывядзіце прыклады, як сваімі ўчынкамі вы прынеслі каму-небудзь радасць. Як вы адчувалі сябе пасля гэтага? Якія пачуцці гэты ўчынак выклікаў у членаў вашай сям'і?

***Гульня «Дзень з жыцця маёй сям'і»**

Выхавальнік размяркоўвае дзяцей на 3 падгрупы і прапаноўвае кожнай падгрупе творчыя заданні: разыграць сцэнку пра тое, што яны робяць разам са сваёй сям'ёй раніцай, днём і вечарам.

# Заняткі 31

## ГРОШЫ

***Задачы:***

- развіваць патрэбу ў пазнанні сацыяльнай рэчаіснасці; фарміраваць уменне выяўляць з дапамогай дарослага прычынна-выніковыя сувязі паміж паняццямі «праца», «прадукт», «грошы», працягваць знаёміць з грашамі, іх функцыямі (сродак для аплаты працы і разлікаў пры здзяйсненні пакупак); выхоўваць эканамічна важныя якасці (беражлівасць, працавітасць, акуратнасць, дысцыплінаванасць);
- *развіваць патрэбнасць у пазнанні сацыяльнай рэчаіснасці; фарміраваць уяўленне пра элементы эканомікі (тавар і паслуга маюць свой кошт, кошт тавару залежыць ад працы, якая ў яго ўкладзена, попыту і прапанавання); выхоўваць эканамічна важныя якасці (беражлівасць, працавітасць, акуратнасць, дысцыплінаванасць).

***Матэрыял:***

- узоры папяровых купюр і манет Беларусі; банкаўская картка; рабочы сшытак (с. 38); мяч;
- *рабочы сшытак (с. 38).

ХОД ЗАНЯТКАЎ

Выхавальнік паказвае дзецям узоры папяровых купюр і манет Беларусі:

— Гэта грошы нашай краіны. Якія бываюць грошы? *(Грошы бываюць металічныя і папяровыя.)* Металічныя грошы — гэта манеткі. У Беларусі яны называюцца… *(капейкі, рублі).* Папяровыя грошы ў нашай краіне называюцца… *(рублі).* Чым адрозніваюцца металічныя грошы ад папяровых? *(Металічныя грошы (манеткі) круглыя, звіняць; папяровыя (купюры) прамавугольныя, шамацяць.)* Разгледзьце грошы. Якія выявы змешчаны на беларускіх грошах? Так, на беларускіх грошах змешчаны выявы славутасцей нашай краіны і лічбы. Купюры рознай вартасці адрозніваюцца колерам.

— Навошта патрэбны грошы? *(Каб рабіць пакупкі.)* У даўнія часы людзі карысталіся толькі манетамі. Пазней яны зразумелі, што гэта не надта зручна. Толькі ўявіце: для таго каб купіць дарагую рэч, трэба было мець пры сабе мяшок манет. Таму сталі выпускаць папяровыя грошы — купюры. Свае грошы ёсць у кожнай краіны. Грошы іншых краін называюцца... *(валюта)*.

— Дзе мы робім пакупкі? *(У магазіне.)* У магазіне мы можам купіць розныя прадметы.

**Гульня «Я куплю...»**

Дзеці ўтвараюць кола. Выхавальнік знаходзіцца ў цэнтры, кідае выхаванцам па чарзе мяч і называе адным словам групу прадметаў *(адзенне, цацкі, ежа, бытавая тэхніка, мэбля)*. Дзеці ловяць мяч і адказваюць, што яны куплялі ў магазіне.

**В.:** Якім адным словам можна назваць усе прадметы, што прадаюцца ў магазіне? *(Тавар.)* Розныя віды магазінаў прадаюць розныя тавары. Закончыце сказы:

1. У гастраноме прадаюцца... *(прадукты харчавання)*.
2. У гіпермаркеце прадаюцца... *(адзенне, прадукты харчавання, касметыка і інш.)*.
3. У магазіне мэблі прадаюцца... *(ложкі, канапы, шафы, сталы, крэслы)*.
4. У магазіне бытавой тэхнікі прадаюцца... *(пральныя машыны, тэлевізары, тэлефоны, фены, прасы і інш.)*.

— Грошы мы плацім не толькі за тавары, але і за паслугі. Як вы думаеце, чым адрозніваецца тавар ад паслугі? *(Тавар — гэта прадмет, а паслугу мы не можам узяць у рукі і памацаць, як прадмет.)* Калі мы плацім за паслугі? *(Калі рамантуем тэлефон, робім стрыжку ў цырульні, купляем білеты ў цырк, кіно.)*

— Грошы важныя для чалавека, таму абыходзіцца з імі трэба беражліва. Як? *(Не рваць, не камячыць, не губляць.)* А як яшчэ вашы бацькі разлічваюцца за тавары і паслугі? *(З дапамогай банкаўскай карткі.)*

Выхавальнік паказвае банкаўскую картку.

— Як грошы трапляюць на банкаўскую картку? У банку ў чалавека ёсць рахунак, на які паступаюць заробленыя ім грошы. Гэта вельмі зручна. Чаму? *(Не трэба насіць з сабой многа грошай. З дапамогай карткі грошы можна атрымаць у банкамаце.)*

38 Разгледзьце выявы. Назавіце ў кожным радзе лішні прадмет (тавар). Чаму вы так думаеце? Абвядзіце лішні прадмет алоўкам чырвонага колеру.

38 Злучыце кропкі. Які прадмет атрымаўся? *(Кашалёк.)* Расфарбуйце кашалёк.

*Выхавальнік чытае дзецям казку Л. Ястрабавай, Н. Мальгінай «Захавальнікі бюджэту» [16].

— Ці даюць вам бацькі грошы для пакупак? Што вы купляеце за свае грошы? Дзе вы захоўваеце свае грошы?

38 *Злучыце кропкі. Які прадмет атрымаўся? *(Кашалёк.)* Расфарбуйце кашалёк. Намалюйце ў ім манеты. *(Колькасць манет і тэхніку малявання вызначае выхавальнік з улікам індывідуальных асаблівасцей дзяцей.)*

## Заняткі 32

### ПАКУПКІ

***Задачы:***

- развіваць патрэбнасць у пазнанні сацыяльнай рэчаіснасці; замацоўваць уменне выяўляць прычынна-выніковыя сувязі паміж паняццямі «праца», «прадукт», «грошы»; пашыраць уяўленне пра функцыі грошай, знаёміць з бюджэтам і магчымасцямі сям’і; выхоўваць эканамічна важныя якасці (беражлівасць, працавітасць, акуратнасць, дысцыплінаванасць), патрэбнасць у павазе з боку іншых людзей і самапавазе, зносінах з людзьмі;
- *развіваць патрэбнасць у пазнанні сацыяльнай рэчаіснасці; фарміраваць уменне самастойна выкарыстоў-

ваць у жыццядзейнасці асноўныя эканамічныя паняцці («грошы», «кошт» («цана»), «валюта», «тавар», «даражэйшы», «таннейшы»); выхоўваць эканамічна важныя якасці (беражлівасць, працавітасць, акуратнасць, дысцыплінаванасць) і патрэбнасці (у працы, павазе з боку іншых людзей, самапавазе, зносінах з людзьмі).

***Матэрыял:***

- вучэбны наглядны дапаможнік (ліст 52); рабочы сшытак (с. 39); мяч;
- *4 лісты ватману (фармат А2); алоўкі.

ХОД ЗАНЯТКАЎ

52 Выхавальнік паказвае дзецям грошы розных краін (беларускія і расійскія рублі, кітайскія юані, кубінскія песа, таджыкскія самані):

— У кожнай краіны ёсць свае грошы. Грошы якіх краін вы ведаеце? Пакажыце і назавіце іх. Што можна купіць за грошы? *(Тавары, паслугі.)* У кожнага тавару і паслугі ёсць свой кошт — гэта тая колькасць грошай, якую трэба заплаціць. Як вы думаеце, ад чаго залежыць кошт? Кошт залежыць ад аб'ёму працы, які чалавек уклаў у стварэнне прадукту, і ад якасці матэрыялу, з якога выраблены тавар. Адны прадметы таннейшыя, значыць, за іх трэба аддаць менш грошай, іншыя — даражэйшыя, значыць, за іх трэба аддаць... *(больш грошай)*.

**Гульня «Што даражэйшае?»**

Дзеці ўтвараюць кола. Выхавальнік знаходзіцца ў цэнтры, кідае выхаванцам па чарзе мяч і называе пару прадметаў. Дзеці ловяць мяч і адказваюць, які з названых прадметаў даражэйшы *(камп'ютар — яблык, стол — халадзільнік, дом — веласіпед, цацка — тэлевізар, тэлефон — талерка, хлебніца — планшэт, нажніцы — ложак, крэсла — канапа, самакат — аўтобус)*.

**В.:** Кошт тавару можа мяняцца. Як вы думаеце, у які час года людзі хутчэй раскупяць санкі? Чаму? *(Узімку, таму*

*што санкі патрэбны для таго, каб катацца па снезе.)* А чаму летам садавіна больш танная? *(Таму што летам садавіна спее і ў нас. Яе не трэба прывозіць здалёк, выдаткаваць грошы на транспарт.)*

— Я зараз прапаную сцвярджэнне. Калі вы з ім пагодзіцеся, тупніце нагамі:

1. Зімовыя боты летам каштуюць танней.
2. Грушы летам больш танныя.
3. Шубу танней купляць зімой.
4. Машына каштуе танней, чым білет на аўтобус.
5. Слівы летам даражэйшыя.
6. У магазіне вінаград каштуе 4 рублі, на рынку — 3. Лепш купляць на рынку.
7. Дом даражэйшы за планшэт.

39 Разгледзьце малюнкі. Што вы на іх бачыце? Расфарбуйце на малюнках прадметы, якія можна купіць. *(Веласіпед, білет у цырк, аловак.)* Што нельга купіць? *(Сонца, вясёлку ў небе, любоў маці да дачкі.)*

***В.:*** Магазіны часам праводзяць распродаж тавараў. Ці купляюць вашы бацькі рэчы на распродажы? Як яны даведваюцца пра скідкі на тавары? Распродаж часта праходзіць напрыканцы сезона, калі попыт на тавары зніжаецца. Напрыклад, лета заканчваецца, а ў магазіне засталося шмат летніх рэчаў. На вуліцы становіцца холадна, летнія рэчы людзям не патрэбны, але яны іх купляюць, бо цэны зніжаны. Калі людзі будуць насіць гэтыя рэчы? *(У наступным годзе, летам.)*

Выхавальнік размяркоўвае дзяцей па 4 камандах, прапаноўвае кожнай камандзе прыдумаць і намаляваць тавар для распродажу летам, затым — тавар для распродажу зімой, і расказаць пра гэтыя тавары.

# Заняткі 33

## ШТО НАМ ТРЭБА І НЕ ТРЭБА КУПЛЯЦЬ

***Задачы:***

- працягваць знаёміць з грашамі і іх функцыямі (сродак для аплаты працы і разлікаў падчас пакупак); фарміраваць элементарныя ўяўленні пра эканамічныя адносіны (на прыкладах літаратурных твораў), уменне самастойна ўжываць у жыццядзейнасці асноўныя эканамічныя паняцці («хатняя гаспадарка», «грошы», «бюджэт», «расходы»), выяўляць прычынна-выніковыя сувязі паміж наяўнасцю грошай і пакупкамі; выхоўваць эканамічна важныя якасці (беражлівасць, працавітасць, акуратнасць, дысцыплінаванасць), патрэбнасці (у павазе з боку іншых людзей, самапавазе, зносінах з людзьмі);
- *развіваць патрэбнасць у пазнанні сацыяльнай рэчаіснасці; фарміраваць уменні ўжываць у маўленні простыя эканамічныя паняцці («грошы», «тавар», «абмен», «бюджэт»), аналізаваць спосабы дзеянняў па набыцці тавараў, узаемасувязь паміж патрэбамі чалавека і бюджэтам сям'і; выхоўваць эканамічна важныя якасці (беражлівасць, працавітасць, акуратнасць, дысцыплінаванасць) і патрэбнасці (у працы, павазе з боку іншых людзей, самапавазе, зносінах з людзьмі).

***Матэрыял:***

- вучэбны наглядны дапаможнік (лісты 53—54); рабочы сшытак (с. 40); мяч;
- *рабочы сшытак (с. 40).

***Папярэдняя работа:*** чытанне дзецям казкі В. Катаева «Квецік-сямíквецік».

### ХОД ЗАНЯТКАЎ

**В.:** Якія тавары мне трэба набыць, калі я хачу есці? *(Малако, хлеб, ёгурт і інш.)* Калі хачу слухаць музыку. *(Бесправадную калонку, навушнікі.)* Калі мне холадна. *(Цёплае адзенне.)* Калі мне трэба наведаць музей ці выставу.

*(Квіткі.)* Навошта людзі купляюць тавары? *(Каб задаволіць свае патрэбнасці і жаданні.)*

— Ёсць рэчы, якія для нас вельмі важныя, і ёсць такія, без якіх мы можам абысціся. Напрыклад, без вады мы жыць не можам, значыць, ваду аднясём да патрэб. А без шакаладу жыць можна, хаця ён і вельмі смачны. Яго мы аднясём да жаданняў. Прывядзіце свае прыклады патрэб і жаданняў.

— У розных людзей розныя патрэбнасці і жаданні. Адкажыце на пытанні:

1. Машынка патрэбна ўнуку ці дзядулю?
2. Зімой нам патрэбны цёплыя боты ці туфлі?
3. Парасон неабходны бацьку, які ідзе па вуліцы пад дажджом, ці маці дома?
4. Таблеткі патрэбны хворай бабулі ці здаровай дачцэ?
5. Улетку нам патрэбна паліто ці сукенка?

— Успомнім казку «Квецік-сяміквецік». Якія жаданні былі ў дзяўчынкі Жэні? *(Быць дома з абаранкамі; каб маміна ваза зноў стала цэлай; апынуцца на Паўночным полюсе; мець усе цацкі на свеце; каб хлопчык Віця ачуняў.)* А што з гэтага было самым неабходным? Калі б у вас была такая чароўная кветачка, якое жаданне вы загадалі б? У людзей шмат жаданняў, але грошай на іх задавальненне хапае не заўсёды. Таму спачатку людзі купляюць тое, што неабходна, а потым — тое, што хочацца. Напрыклад, прадстаўнікам розных прафесій для працы патрабуюцца розныя інструменты і матэрыялы.

**Гульня «Адгадай, што каму трэба»**

Дзеці ўтвараюць кола. Выхавальнік стаіць у цэнтры, кідае выхаванцам па чарзе мяч і называе прафесію. Дзеці ловяць мяч і адказваюць, што патрэбна для працы прадстаўніку гэтай прафесіі. *(Цырульніку — нажніцы, фен; настаўніку — указка, крэйда; паштальёну — сумка; пісьменніку — папера, камп'ютар; фатографу — фотаапарат; пажарнаму — лесвіца, шланг.)*

53—54 Выхавальнік звяртае ўвагу дзяцей на ілюстрацыі:

— Разгледзьце малюнкі. Назавіце, у каго якія патрэбнасці. А што вам трэба? Пакажыце гэта на малюнку і назавіце.

**Гульня «Патрэбныя рэчы»**

Дзеці перадаюць адно аднаму мяч па крузе і гавораць, якія рэчы (тавары) каму патрэбны.

— Якія тавары могуць задаволіць патрэбнасці і жаданні чалавека? *(Прадукты харчавання, адзенне, абутак, мэбля і інш.)*

— Што неабходна дзецям? *(Цацкі, веласіпед, самакат, адзенне, абутак і інш.)*

— Што неабходна мужчынам? *(Адзенне, абутак, машына, спартыўны інвентар і інш.)*

— Што неабходна жанчынам? *(Адзенне, абутак, касметыка, посуд і інш.)*

**В.:** У людзей шмат розных жаданняў, ім многае неабходна. А якія самыя галоўныя жаданні? Акрамя прадуктаў, жылля, рэчаў, людзі маюць патрэбу ў зносінах, дружбе, каханні, ведах, бяспецы.

40 Здагадайцеся, да якой казкі выканана ілюстрацыя. *(Да казкі «Заячая хатка».)* У чым мелі патрэбу персанажы казкі? Расфарбуйце ілюстрацыю.

***Гульня «Што купіць?»**

**В.:** Вы будзеце выконваць ролю бацькоў, якім трэба вырашыць, куды патраціць грошы. Цалкам натуральна траціць грошы як на патрэбы, так і на жаданні. Але калі грошай недастаткова, трэба вырашыць, што купіць у першую чаргу. Я пачну задаваць пытанні. Калі вы лічыце, што правільны адказ «так», то скачыце. Калі лічыце, што правільны адказ «не», не рухайцеся.

— Калі ў вас ёсць магчымасць купіць нешта адно — макарону або цукеркі, ці будзеце вы купляць цукеркі? *(Не.)*

— Калі ў вас ёсць магчымасць купіць нешта адно — цацкі або адзенне, ці купіце вы адзенне? *(Так.)*

— Калі ў вас ёсць магчымасць купіць нешта адно — малако або кока-колу, ці купіце вы малако? *(Так.)*

— Калі ў вас ёсць магчымасць купіць нешта адно — кватэру ці машыну, ці купіце вы машыну? *(Не.)*

— Калі ў вас ёсць магчымасць купіць нешта адно — хлеб або торт, ці будзеце вы купляць хлеб? *(Так.)*

***В.:*** Жаданні чалавека павінны быць разумнымі. Як вы гэта разумееце? *(Нельга купіць усё, што хочацца.)* Успомніце казку «Квецік-сяміцвецік». Якія неразумныя жаданні былі ў дзяўчынкі Жэні?

40 *Здагадайцеся, да якой казкі выканана ілюстрацыя. *(Да твора А. С. Пушкіна «Казка пра рыбака і рыбку».)* Якія жаданні былі ў старой? З чым засталася старая? Дамалюйце малюнак па кропках і расфарбуйце яго.

## Заняткі 34

### ДАХОДЫ І РАСХОДЫ СЯМЕЙНАГА БЮДЖЭТУ

***Задачы:***

- развіваць сацыяльныя і пазнавальныя матывы, арганізатарскія здольнасці; фарміраваць уяўленні пра даходы і расходы сямейнага бюджэту, патрэбнасці членаў сям'і, эканамічныя адносіны (на прыкладах літаратурных твораў), прычынна-выніковыя сувязі паміж наяўнасцю грошай і пакупкамі; выхоўваць эканамічна важныя якасці (беражлівасць, працавітасць, акуратнасць, дысцыплінаванасць), патрэбнасці (у павазе з боку іншых людзей, самапавазе, зносінах з людзьмі);
- *развіваць арганізатарскія здольнасці; фарміраваць уменне раскрываць з дапамогай дарослага значэнне паняцця «рэклама»; вучыць спосабам дзеянняў па набыцці тавараў; выхоўваць эканамічна важныя якасці (беражлівасць, працавітасць, акуратнасць, дысцыплінаванасць), патрэбнасці (у працы, павазе з боку іншых людзей і самапавазе, зносінах з людзьмі).

***Матэрыял:***

- вучэбны наглядны дапаможнік (ліст 55); рабочы сшытак (с. 41); мяч;

- *рэкламныя буклеты; цацкі: машынка, веласіпед, лялька, мяч.

### ХОД ЗАНЯТКАЎ

**В.:** Мы ўжо расказвалі адно аднаму пра свае сем'і. Хто атрымлівае грошы ў вашых сем'ях?

— Закончыце сказы:

1. Заработную плату атрымліваюць... *(мама і тата)*.
2. Пенсію атрымліваюць... *(бабуля і дзядуля)*.
3. Стыпендыю атрымліваюць... *(старэйшы брат (сястра))*.
4. Дапамогу атрымліваюць... *(маці на маленькіх дзяцей; хворыя людзі; тыя, хто страціў працу)*.

— Сапраўды, бацькі атрымліваюць заработную плату за сваю працу. Бабулі і дзядулі выплачваецца пенсія, бо яны дасягнулі пэўнага ўзросту. Старэйшыя браты ці сёстры вучацца ў каледжах, універсітэтах, і дзяржава выплачвае ім стыпендыю. Маці, якія выхоўваюць маленькіх дзяцей, а таксама хворыя людзі, якія не могуць працаваць, і тыя, хто страціў працу, атрымліваюць ад дзяржавы дапамогу. Усе грошы, якія атрымлівае сям'я, называюцца даходамі.

55 Выхавальнік звяртае ўвагу дзяцей на ілюстрацыі:

— Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, на што сям'я расходуе грошы. Якія расходы ў сям'і адносяцца да неабходных? *(Набыццё прадуктаў харчавання, адзення, абутку; плата за карыстанне электрычнасцю, вадой, газам, тэлефонам, інтэрнэтам; за дзіцячы сад, праезд у транспарце.)* Грошы кожная сям'я траціць па-рознаму. Як у вашай сям'і трацяць грошы? *(Купляюць кнігі, часопісы; трацяць на паходы ў кіно, цырк, тэатр.)*

**Гульня «Даходы — расходы»**

Дзеці ўтвараюць кола. Выхавальнік стаіць у цэнтры, кідае выхаванцам па чарзе мяч і прапаноўвае сітуацыю. Дзеці ловяць мяч і адказваюць, да якой катэгорыі можна аднесці гэту сітуацыю: да даходаў сям'і ці расходаў. *(Купілі тэлевізар —*

*расходы, бабуля атрымала пенсію — даходы, брат атрымаў стыпендыю — даходы, заплацілі цырульніку за стрыжку — расходы, тата выйграў у латарэю — даходы і г. д.)*

**В.:** Даходы і расходы складаюць сямейны бюджэт. У адных сем'ях даходы меншыя за расходы. Што гэта значыць? *(У сям'і не хапае грошай.)* У некаторых сем'ях даходы перавышаюць расходы. Што могуць рабіць людзі ў такіх выпадках? *(Адкладваць грошы на буйную пакупку або падарожжа.)* А ў некаторых сем'ях даходы такія ж, як і расходы. Што гэта значыць? *(Сям'я траціць грошай столькі, колькі зарабляе.)*

41 Якія расходы можна аднесці да разраду самых неабходных для кожнага члена сям'і? На што расходуюць грошы члены сям'і? Намалюйце гэтыя прадметы (рэчы і інш.).

*Выхавальнік чытае верш С. Міхалкова «Як стары карову прадаваў» [15].

— Як вы думаеце, чаму старому не ўдалося прадаць карову, а ў хлопца гэта атрымалася? *(Хлопец расказаў пра галоўныя добрыя якасці свайго тавару, а стары не здолеў гэта зрабіць.)* Іншымі словамі, хлопец прарэкламаваў свой тавар. Як вы думаеце, што такое рэклама? *(Паказ прадмета, які прадаецца; паведамленне (верш) пра самыя важныя якасці прадмета.)* Рэклама патрэбна для таго, каб пра тавар ці паслугі даведалася большая колькасць людзей. Рэклама дапамагае прадаць тавар.

Выхавальнік паказвае дзецям рэкламныя буклеты:

— Якія тавары рэкламуюцца? *(Прадукты харчавання, адзенне, абутак, мэбля і інш.)* Рэклама з'явілася даўно: булачнік вывешваў каля пякарні булку, шавец — бот, кравец — сукенку. Пры дапамозе такой рэкламы людзям лёгка было знайсці патрэбнае месца. А дзе сёння размяшчаюць рэкламу? *(У газетах, часопісах, на радыё, тэлебачанні, на вуліцы, у інтэрнэце.)* Галоўнае, каб рэклама была зразумелай і заўважнай.

— Зараз мы падзелімся на каманды і паспрабуем прарэкламаваць цацкі — машынку, веласіпед, ляльку, мяч. У сваёй рэкламе вы павінны адзначыць лепшыя якасці цацкі, спосабы гульні з ёй, перавагі перад іншымі цацкамі. (Выхавальнік размяркоўвае дзяцей на 4 падгрупы і прапаноўвае кожнай падгрупе пэўную цацку для рэкламавання.)

## Заняткі 35

### ЗАХОЎВАННЕ ГРОШАЙ У БАНКУ

***Задачы:***

- развіваць сацыяльныя і пазнавальныя матывы, арганізатарскія здольнасці; фарміраваць уяўленні пра банк, багацце і беднасць, правілы паводзін у сітуацыях, звязаных з грашамі, эканамічныя адносіны (на прыкладзе літаратурных твораў), уменне выяўляць прычынна-выніковыя сувязі паміж наяўнасцю грошай і пакупкамі; вучыць спосабам дзеянняў па набыцці тавару; выхоўваць асновы маральных каштоўнасцей (паняцце пра справядлівасць, працавітасць і інш.);
- *развіваць арганізатарскія здольнасці; фарміраваць уменні ўжываць у маўленні найпрасцейшыя эканамічныя паняцці («грошы», «банк», «кошт» («цана»)), адрозніваць базісныя эканамічныя якасці жыццядзейнасці людзей (беражлівасць і інш.); выхоўваць патрэбнасць у дасягненні высокіх вынікаў з найменшымі выдаткамі.

***Матэрыял:***

- рабочы сшытак (с. 42);
- *рабочы сшытак (с. 42); 2 канверты з разрэзанымі рэкламнымі буклетамі; дробныя фішкі; папера для кожнага дзіцяці; алоўкі.

***Папярэдняя работа:*** чытанне казкі А. Н. Талстога «Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна», арганізацыя сюжэтна-ролевай гульні «Банк».

ХОД ЗАНЯТКАЎ

**В.:** Успомніце казку «Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна». Чаму Бураціна закапаў грошы ў зямлю? Як вы думаеце, куды трэба было аднесці грошы, каб з цягам часу іх стала больш? *(У банк.)* Банк — гэта спецыяльнае месца для захоўвання грошай. За захоўванне налічваюцца працэнты — дадатковыя грошы. Так людзі павялічваюць свой даход.

Выхавальнік чытае дзецям казку К. Кашкінай «Дзе жывуць грошыкі?» [22].

— Ці спадабалася вам казка? Ці былі вы калі-небудзь у банку? Што робяць людзі, калі прыходзяць у банк? *(Мяняюць грошы, аплачваюць камунальныя паслугі, афармляюць пазыку.)* Грошы, якія людзі захоўваюць у банку, называюцца зберажэннямі. Як вы думаеце, навошта патрэбны зберажэнні? *(Каб купіць дарагую рэч, пабудаваць жыллё, паехаць у падарожжа, аплаціць вучобу.)*

**Гульня «Закончы прыказку і растлумач»**

Дзецям прапаноўваецца закончыць прыказку і растлумачыць яе значэнне:

1. На што попыт, на тое і... *(цана)*.
2. Запас бяды не... *(чыніць)*.
3. Абыякавы двойчы робіць, а скупы тройчы... *(плаціць)*.
4. Добры тавар сам сябе... *(хваліць)*.
5. Хоць лай, а грошы... *(аддай)*.

**В.:** Калі б у вас было шмат грошай, што б вы купілі ці зрабілі?

— Чалавек можа здзейсніць шмат добрых спраў, палепшыць сваё жыццё і жыццё іншых людзей. Каб аказаць падтрымку тым, хто мае патрэбу ў дапамозе, ладзяцца розныя мерапрыемствы: дабрачынныя канцэрты, святы, выставы.

— Якія людзі маюць патрэбу ў дапамозе? *(Пажылыя людзі, хворыя і інш.)*

42 Дамалюйце і расфарбуйце скарбонку. Раскажыце, на што вы можаце збіраць грошы.

***Гульня «Знаўцы»**

Дзеці размяркоўваюцца па 2 камандах. Выхавальнік задае камандам па чарзе пытанні. За правільны адказ кожная каманда атрымлівае 1 фішку. Калі з адказам узніклі цяжкасці, адказаць можа іншая каманда.

1. Што можна набыць за грошы? *(Тавары, паслугі.)*

2. Колькасць грошай, якія трэба заплаціць за тавар ці паслугу, — гэта... *(кошт)*.

3. Як называюцца ўсе грошы, якія атрымлівае сям'я? *(Даходы.)*

4. Тое, што нам неабходна, і тое, што нам хацелася б мець, — гэта... *(патрэбнасці)*.

5. Што атрымліваюць бацькі за сваю працу? *(Заработную плату.)*

6. Грошы, за якія набываюцца тавары ці аплачваюцца паслугі, называюцца... *(расходамі)*.

7. Што атрымліваюць дзядуля і бабуля? *(Пенсію.)*

8. Як называецца ўстанова, у якой захоўваюцца грошы? *(Банк.)*

9. Даходы і расходы ўсіх членаў сям'і складаюць... *(сямейны бюджэт)*.

***Гульня «Мазаіка»**

Дзеці размяркоўваюцца па 2 камандах. Кожнай камандзе даецца канверт, у якім ляжыць разрэзаны рэкламны буклет. Дзецям неабходна скласці з частак рэкламны ліст, высветліўшы, пра які тавар пойдзе размова. Потым трэба назваць тавар, паказаны на малюнку, і прарэкламаваць яго. Выйграе тая каманда, якая першай скласць выяву і назаве яе.

42 *Што б вы купілі для сваёй сям'і, калі б мелі зберажэнні ў банку? Раскажыце і намалюйце.

# Заняткі 36

## ЭКАНОМІЯ І БЕРАЖЛІВАСЦЬ У СЯМ'І

***Задачы:***

- фарміраваць элементарныя ўяўленні пра рацыянальнае ўжыванне рэсурсаў, якія патрэбны чалавеку; выхоўваць патрэбнасць у захаванні і прымнажэнні прыродных багаццяў;
- *развіваць сацыяльныя і пазнавальныя матывы; фарміраваць уменні прымяняць з дапамогай дарослага і самастойна спосабы эканомнага і беражлівага выкарыстання вады, электраэнергіі, цяпла, рэчаў; адрозніваць базісныя эканамічныя якасці жыццядзейнасці людзей (беражлівасць і інш.), выхоўваць патрэбнасць у захаванні і прымнажэнні прыродных багаццяў.

***Матэрыял:***

- вучэбны наглядны дапаможнік (лісты 56—57); рабочы сшытак (с. 43); 4 канверты з разрэзанымі сюжэтнымі малюнкамі (чыстка зубоў, мыццё бялізны, мыццё посуду, выціранне пылу); мяч;
- *мяч; ліст ватману (фармат А2); алоўкі.

ХОД ЗАНЯТКАЎ

56 Выхавальнік звяртае ўвагу дзяцей на ілюстрацыі:

— Разгледзьце малюнкі. Хто паводзіць сябе правільна, а хто — не? Каго можна назваць эканомным, а каго — не? Эканомны чалавек беражліва расходуе тое, што ў яго ёсць. Што мы павінны эканоміць дома? *(Ваду, электрычнасць, цяпло, газ.)* Чаму? *(Чым больш мы будзем расходаваць, тым больш грошай заплацім. Прыродныя рэсурсы трэба берагчы, інакш мы застанемся без іх.)* Уявіце, што было б, калі б у вашай кватэры раптам знікла вада *(газ, электрычнасць, цяпло)*.

57 **Гульня «Я эканомны»**

Выхавальнік размяркоўвае дзяцей па 4 камандах. Кожная каманда атрымлівае канверт, у якім ляжыць разрэзаны сюжэтны малюнак. Каманды састаўляюць малюнак, назы-

ваюць, што на ім паказана і што трэба рабіць для таго, каб эканоміць ваду. *(Закрываць кран; выкарыстоўваць для паласкання рота падчас чысткі зубоў шклянку; для мыцця посуду набіраць ваду ў ракавіну і г. д.)*

**В.:** Я буду прапаноўваць сцвярджэнні. Калі вы з імі згодныя, пляскайце ў далоні, калі не згодныя, тупайце нагамі:

1. Трэба выключаць святло, калі выходзіш з пакоя.
2. Нельга закрываць кран з вадой, пакуль чысціш зубы.
3. Трэба закрываць кран, каб не капала вада.
4. Нельга выкарыстоўваць энергазберагальныя лямпачкі ў кватэры.
5. Можна пакідаць уключанымі электрычныя прыборы, калі сыходзіш з дому.
6. Нельга сыходзіць з дому, пакуль на пліце гатуецца ежа.
7. Можна пакідаць зарадную прыладу ў разетцы.
8. Нельга ўключаць усе электрапрыборы адначасова.
9. Трэба ўцяпляць і зачыняць уваходныя дзверы.

— Мы ўжо гаварылі, што быць беражлівым — гэта значыць беражліва ставіцца да ўсяго, што мы маем. Назавіце рэчы, якія ёсць у вас дома. *(Дзеці перадаюць па крузе мяч і называюць па адным прадмеце.)* Правільна, гэта цацкі, мэбля, абутак, адзенне, посуд. Адкуль гэтыя рэчы з’явіліся ў вас? *(Дарослыя купілі, стварылі сваёй працай.)* Што трэба рабіць, каб выкарыстоўваць рэчы як мага даўжэй? *(Выкарыстоўваць па прызначэнні, не рваць, не ламаць.)*

Выхавальнік чытае верш Л. Шырына «Наша Яня» [2]:

Любім мы сваю Янінку,
Нашу слаўную дзяўчынку.
Рана, рана ўстане Яня,
Скажа бабцы:
— Прывітанне!
Скажа маме:
— Добры дзень!
На граду затым ідзе
І з ахвотаю, старанна
Памагае маме Яня.
А затым яна за дзедам
Неадлучна ходзіць следам:

Пад паветку носяць дровы,
Козак пасвяць і карову.
З дзедам разам ад азерца
Прынясуць вады вядзерца.
Хай купаюцца ля хаты
У вадзіцы качаняты...

— Каго з персанажаў верша можна назваць добрым гаспадаром? Як вы думаеце, каго называюць добрым гаспадаром? *(Беражлівага, запаслівага, працавітага чалавека.)* Якім яшчэ словам можна назваць такога чалавека? *(Гаспадарлівы.)* Так, добры гаспадар правільна вядзе хатнюю гаспадарку, мудра распараджаецца сямейным бюджэтам. Ці можаце вы назваць сваіх бацькоў гаспадарлівымі? Чаму? А як вы дапамагаеце бацькам дома? *(Складваем свае рэчы, прыбіраем цацкі; робім уборку, паліваем кветкі; выключаем святло, калі выходзім з пакоя, і г. д.)*

43 Мастак дапусціў памылкі. Знайдзіце іх і раскажыце, як выглядаюць прадметы на малюнку. *(Машынка без колаў, чайнік без носіка, крэсла без спінкі, люстра без лямпачкі.)* Дамалюйце адсутныя дэталі.

***В.:** Што мы павінны берагчы і эканоміць дома; у дзіцячым садзе?

### *Гульня «Назаві правілы эканоміі»

Дзеці ўтвараюць кола. Выхавальнік стаіць у цэнтры, кідае выхаванцам па чарзе мяч і прапаноўвае закончыць сказ. *(Трэба мыць посуд, набіраючы ваду... (у ракавіну); трэба закрываць кран, каб... (не капала вада); карыстацца няспраўнымі прыборамі... (нельга); лямпачкі трэба выкарыстоўваць... (энергазберагальныя); трэба паласкаць рот падчас чысткі зубоў вадой... (са шклянкі) і г. д.)*

***В.:** Дома і ў дзіцячым садзе мы павінны беражліва ставіцца да рэчаў. Як вы можаце быць эканомнымі ў дзіцячым садзе? Гаспадарлівы чалавек таксама правільна сартуе смецце. Навошта? *(Каб зрабіць са старых прадметаў новыя.)* Якое смецце трэба збіраць у кантэйнеры розных колераў? *(Паперу, пластык, шкло.)*

***Гульня «Карысныя рэчы з адходаў»**

Выхавальнік прапаноўвае дзецям перадаваць па крузе мяч і называць прадметы, якія можна зрабіць з адсартаванага смецця. Затым дзеці разам ствараюць малюнак на лісце ватману на тэму «Другое жыццё прадметаў».

# Блок 5. Я і іншыя людзі

## Заняткі 37

### КЛОПАТ ПРА ЗДАРОЎЕ

***Задачы:***

- развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго «я», свайго ўнутранага свету; вучыць спосабам захавання, умацавання свайго здароўя і жыцця з дапамогай дарослага і самастойна; фарміраваць уменні ўважліва ставіцца да свайго здароўя, абслугоўваць сябе ў побыце, выкарыстоўваць па прызначэнні прадметы гігіены; выхоўваць уважлівае стаўленне да свайго здароўя і здароўя іншых людзей як перадумову здаровага ладу жыцця;
- *фарміраваць патрэбнасць у гартавальных працэдурах, уяўленні пра карысць загартоўвання для здароўя; уменні прымяняць культурна-гігіенічныя навыкі, уважліва ставіцца да свайго здароўя без напаміну з боку дарослага; выхоўваць пачуццё самакаштоўнасці.

***Матэрыял:*** вучэбны наглядны дапаможнік (ліст 58); рабочы сшытак (с. 44); мяч.

ХОД ЗАНЯТКАЎ

Выхавальнік чытае дзецям верш У. Карызны «Алеся і Янка» [2]:

Каля хаты на мяжы
Выраслі гурочкі.
Каб знайсці іх, трэба мець,
Як у Янкі, ... *(вочкі)*.

Выйшаў месяц пагуляць,
Сеў каля дарожкі.

Каб з Алесяй ён пабег,
Дайце яму... *(ножкі)*.

На світанні за ракой
Заспявалі птушкі.
Каб пачуць іх, трэба мець,
Як у Янкі, ... *(вушкі)*.

Шмат арэхаў, але ў іх
Моцныя шкарлупкі.
Ды раскусваюць уміг
Іх Алесі... *(зубкі)*.

У гародзе на градзе
Шмат салодкай бручкі.
А каб вырваць, трэба мець,
Як у Янкі, ... *(ручкі)*.

На двары стаіць зіма.
Гурбы — як ахапкі.
Мерзнуць вушы, мерзне лоб,
Як ідзеш без... *(шапкі)*.

— Пра якіх памочнікаў чалавека гаворыцца ў вершы? Калі нашы памочнікі здаровыя, тады і цела адчувае сябе добра. Што значыць «быць здаровым»? *(Гэта калі чалавек не хварэе.)* А як мы можам умацаваць сваё здароўе? *(Займацца фізкультурай, рабіць раніцай гімнастыку, загартоўвацца, есці шмат садавіны і агародніны.)*

58 Выхавальнік паказвае дзецям ілюстрацыі:

— Разгледзьце малюнкі. Як дзеці клапоцяцца пра сваё здароўе? Для таго каб умацаваць і захаваць здароўе, трэба прытрымлівацца распарадку дня, абавязкова даглядаць сваё цела, гуляць кожны дзень на свежым паветры, апранацца згодна з надвор'ем. Таксама важна піць чыстую ваду і ўжываць у ежу прадукты, багатыя на вітаміны. Вітаміны, як салдаты, абараняюць наш арганізм ад хвароб. А ў якіх прадуктах шмат вітамінаў? *(У агародніне, садавіне, ягадах.)*

**Гульня «Карысна — шкодна»**

Дзеці ўтвараюць кола. Выхавальнік стаіць у цэнтры, кідае выхаванцам па чарзе мяч і называе прадукты. Пачуўшы на-

зву карыснага прадукту, дзеці ловяць мяч; калі названы прадукт шкодны для здароўя, адбіваюць мяч.

**В.:** Што можа здарыцца з чалавекам, калі ён не будзе клапаціцца пра сваё здароўе? *(Чалавек захварэе.)* Як мы сябе адчуваем, калі хварэем? *(У нас што-небудзь баліць, дрэнны настрой, нічога не хочацца.)* Хварэць вельмі непрыемна, гэта нікому не падабаецца. Каб хутчэй ачуняць, трэба звярнуцца да ўрача і прымаць лекі, якія ён прызначыць.

— Што яшчэ трэба рабіць, каб не хварэць? *(Прышчэпкі.)* А вы баіцеся рабіць прышчэпкі? Прышчэпак не трэба баяцца, таму што яны дапамагаюць нашаму арганізму абараніцца ад хвароб.

44 Дамалюйце па кропках агародніну і садавіну. Расфарбуйце.

***В.:** Як вы думаеце, што можа выклікаць хваробу? Хваробу могуць выклікаць мікробы, якія жывуць у арганізме чалавека. Што трэба рабіць хвораму чалавеку, каб не заразіць іншых людзей?

— Змагацца з мікробамі можна з дапамогай цыбулі і часнаку. Цыбуля і часнок выдзяляюць рэчывы, ад якіх мікробы гінуць. Як можна выкарыстоўваць цыбулю і часнок? *(Іх можна дабаўляць у ежу, нюхаць.)* А яшчэ часнок ці цыбулю можна пакласці ў скрыначку з адтулінамі, прымацаваць да яе стужку і насіць на шыі.

Выхавальнік прапаноўвае дзецям зрабіць дома «кулоны» з футляраў ад кіндар-сюрпрызаў (для ўсіх членаў сям'і) і пакласці ў іх па 2-3 зубчыкі часнаку. Выхавальнік звяртае ўвагу на тое, што часнок трэба класці ў скрыначку кожную раніцу, а вечарам вымаць яго і мыць скрыначку.

## Заняткі 38

### АКАЗАННЕ ПЕРШАЙ ДАПАМОГІ

***Задачы:***

- фарміраваць уменне аказваць першую дапамогу (у прысутнасці дарослага) пры атрыманні бытавой траўмы

(пры апёках, ударах, сіняках, драпінах, ранках); выхоўваць усвядомленае стаўленне да захавання здароўя і жыцця;
- *заахвочваць самастойна клапаціцца пра здароўе, звяртацца па дапамогу да дарослага пры дрэнным самаадчуванні; фарміраваць уменне аказваць першую дапамогу сабе і іншаму чалавеку (у прысутнасці дарослага); выхоўваць усвядомленае стаўленне да захавання здароўя і жыцця.

***Матэрыял:***
- рабочы сшытак (с. 45);
- *рабочы сшытак (с. 45).

ХОД ЗАНЯТКАЎ

**В.:** Што трэба рабіць, калі чалавек атрымаў траўму (парэзаў палец, зламаў нагу і г. д.)? *(Трэба патэлефанаваць па нумары 103 і выклікаць хуткую дапамогу.)* Назавіце нумары тэлефонаў, па якіх трэба тэлефанаваць у экстранных выпадках *(112, 101, 103).*

— Часам дзеці атрымліваюць траўмы. Што трэба рабіць у такой сітуацыі? *(Звяртацца па дапамогу да дарослых.)* Паслухайце гісторыю, якая адбылася з дзяўчынкай Машай. Аднойчы Маша гуляла ў двары і незнарок парэзала палец. Ёй было балюча і страшна. Што рабіць? Машы трэба абавязкова звярнуцца па дапамогу да дарослага, прамыць парэз вадой і падняць пальчык дагары, каб спынілася кроў. А потым што трэба зрабіць? *(Заклеіць ранку пластырам або забінтаваць.)*

Выхавальнік прапаноўвае дзецям намаляваць на дошцы схему дзеянняў у выглядзе значкоў, а затым паўтарыць паслядоўнасць дзеянняў пры парэзе.

— Зараз мы з вамі прыдумаем набор значкоў для схемы дзеянняў пры парэзе. *(Напрыклад, «прамыць» — выява кроплі; «заклеіць пластырам» — прамавугольнік зялёнага колеру; «забінтаваць» — прамавугольнік белага колеру і г. д.)*

— А вось гісторыя, якая адбылася з хлопчыкам Сашам. Саша катаўся на веласіпедзе, наехаў на камень і ўпаў на асфальт. Ён моцна ўдарыўся і падрапаў калені. Саша заплакаў.

Як яму можна дапамагчы? *(Трэба абавязкова звярнуцца па дапамогу да дарослага, да месца ўдару прыкласці халодны прадмет, а ранку прамыць халоднай вадой, апрацаваць ёдам або перакісам вадароду і заляпіць пластырам.)*

Выхавальнік прапаноўвае дзецям намаляваць на дошцы схему дзеянняў у выглядзе значкоў, а затым паўтарыць паслядоўнасць дзеянняў для апісанай сітуацыі.

— А гэта гісторыя адбылася з дзяўчынкай Оляй. Стаяла гарачае лета. Оля без галаўнога ўбору гуляла разам з бацькамі на лясной паляне. Раптам у яе закружылася галава. Што павінна зрабіць Оля? *(Падысці да бацькоў і сказаць, што кружыцца галава.)* Трэба абавязкова знайсці цень, прылегчы і папіць вады. А калі стан цяжкі, што трэба зрабіць? *(Выклікаць урача па нумары тэлефона 103.)* Менавіта ўрач зможа аказаць дапамогу ў такіх выпадках.

Выхавальнік прапаноўвае дзецям намаляваць на дошцы схему дзеянняў у выглядзе значкоў, а затым паўтарыць паслядоўнасць дзеянняў для апісанай сітуацыі.

— А калі вы раптам апякліся? Хто з вас атрымліваў апёк? Як вы сябе адчувалі? *(Было балюча, плакалі.)* Калі з вамі здарылася такая непрыемнасць, трэба абавязкова звярнуцца па дапамогу да дарослага. Калі яго няма паблізу, неабходна пару хвілін патрымаць абпаленае месца пад струменем халоднай вады.

Выхавальнік прапаноўвае дзецям намаляваць на дошцы схему дзеянняў у выглядзе значкоў, а затым паўтарыць паслядоўнасць дзеянняў для апісанай сітуацыі.

### Гульня «Як сябе паводзіць»

Выхавальнік размяркоўвае дзяцей па 4 камандах і прапаноўвае кожнай камандзе паказаць, як трэба сябе паводзіць, калі парэзаў палец, ударыўся, перагрэўся на сонцы, абадраў скуру на назе, атрымаў апёк рукі.

**В.:** Давайце прыдумаем правілы на тэму «Як засцерагчыся ад апёкаў». Закончыце сказы:

1. Да ўключанай кухоннай пліты... *(нельга падыходзіць блізка)*.

2. Перш чым купацца ў ванне, неабходна праверыць, ці не занадта гарачая вада. Для гэтага трэба... *(апусціць кончык пальца ў ваду)*.

3. Для таго каб памыцца, спачатку адкрываюць кран з... *(халоднай вадой)*.

45 Намалюйце ў выглядзе значкоў паслядоўнасць дзеянняў хлопчыка, які ўдарыў каленку.

***В.:** Падыміце руку тыя, хто рэдка хварэе. Каму падабаецца хварэць? Як вы сябе адчуваеце, калі хварэеце? *(Баляць галава, горла; з'яўляюцца насмарк, кашаль, млоснасць.)* Што трэба рабіць пры прастудных захворваннях, каб хутчэй ачуняць? *(Прымаць пад кантролем дарослых лекі і вітаміны, піць больш вадкасці, часцей праветрываць памяшканне.)*

— Як трэба паводзіць сябе пры дрэнным самаадчуванні? *(Трэба прытрымлівацца пасцельнага рэжыму, больш адпачываць; нельга піць халодныя напіткі, есці халодную ежу, знаходзіцца на холадзе, займацца спортам.)*

— Давайце сфармулюем правілы, выконваючы якія вы не захварэеце.

1. Насіць адзенне і абутак згодна з сезонам.
2. Гуляць на свежым паветры ў любое надвор'е.
3. Ужываць у ежу садавіну і агародніну.
4. Не прымаць лекі без дарослых.

45 *Расфарбуйце або абвядзіце па контуры прадукты, якія дапамогуць вам захаваць здароўе.

## Заняткі 39

### ЭМОЦЫІ: МАЕ І ІНШЫХ ЛЮДЗЕЙ

***Задачы:***

- развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго «я», асаблівасцей іншых людзей; фарміраваць уменні прыслухоўвацца да сябе (да сваіх перажыванняў, эмацыянальнага стану), праяўляць добразычлівасць, спагаду; вучыць спосабам праяўлення суперажывання, пазітыўнага стаўлення да сябе і іншых людзей; выхоўваць асобас-

ныя якасці, якія з'яўляюцца залогам паспяховых зносін (добразычлівасць, эмпатыю і інш.);

- *развіваць схільнасць да аказання эмацыянальнай падтрымкі, садзейнічання іншаму чалавеку на аснове атаясамлівання свайго «я» з ім; фарміраваць жаданне і ўменне аказваць эмацыянальную падтрымку, праяўляць спагаду, садзейнічанне; вучыць спосабам культуры зносін з аднагодкамі з дапамогай дарослага і самастойна; выхоўваць маральныя якасці і добразычлівае стаўленне да іншых людзей (аднагодак, дзяцей малодшага ўзросту, дарослых).

***Матэрыял:***

- вучэбны наглядны дапаможнік (ліст 59); рабочы сшытак (с. 46); невялікія люстэркі (па колькасці дзяцей);
- *папяровыя талеркі (з адтулінамі для вачэй і вяровачкамі па баках) (на кожнае дзіця); алоўкі.

ХОД ЗАНЯТКАЎ

59 Выхавальнік прапаноўвае дзецям разгледзець ілюстрацыі:

— Паглядзіце на твары дзяцей. Як вы думаеце, гэта дзіця сумнае ці радаснае? *(Радаснае.)* Калі вы радуецеся? *(Калі здарылася нешта прыемнае, калі весела, смешна.)* А гэта дзіця якое? *(Сумнае.)* Калі вы засмучаецеся? *(Калі цацка зламалася, калі моцна ўдарыўся.)* А гэта дзіця якое? *(Злое.)* Калі вы злуяцеся? *(Калі не атрымліваецца нешта зрабіць.)* А гэта дзіця якое? *(Здзіўленае.)* Калі вы здзіўляецеся? *(Калі што-небудзь здараецца нечакана.)* А гэта дзіця якое? *(Збянтэжанае.)* Калі вы адчуваеце сябе збянтэжаным? *(Калі вакол шмат людзей, а мне трэба расказаць верш.)* А гэта дзіця якое? *(Спалоханае.)* Калі вы палохаецеся? *(Калі брэша сабака.)*

**Гульня «Паўтары эмоцыю»**

Дзеці і выхавальнік садзяцца ў кола. Кожнае дзіця трымае ў руках люстэрка. Выхавальнік паказвае пералічаныя вышэй эмоцыі і прапаноўвае выканаць дзеянне перад

люстэркам. Пры гэтым ён звяртае ўвагу дзяцей на тое, як выглядаюць іх бровы, вочы, рот.

**В.**: Мы можам зразумець, што адчуваюць іншыя людзі, калі паглядзім на выраз іх твараў. Вызначаць эмоцыі людзей мы можам і па маўленні: калі чалавек сумуе ці радуецца, ён злы ці шчаслівы, яго голас гучыць па-рознаму.

Выхавальнік прапаноўвае гульнявыя сітуацыі. Дзеці інсцэніруюць іх, а потым называюць эмоцыі.

1. Вы ўдзельнічалі ў прабежцы з групай дзяцей, беглі хутка і прыбеглі першым. Што вы адчулі?

2. Сябар папрасіў пагуляць з вашай любімай цацкай. Вы дазволілі, але ён вярнуў цацку зламанай. Што вы адчулі?

Выхавальнік чытае дзецям верш І. Муравейкі «Я сама» [2]:

— Хадзі, будзем апранацца...
— Я сама! Я сама!
— Хадзі, будзем умывацца...
— Я сама! Я сама!
— Дык хадзі хоць прычашу я...
— Я сама! Я сама!
Вось умеліца якая
Наша Танечка малая!

Выхавальнік прапаноўвае ўспомніць і прачытаць верш І. Муравейкі «Адмарозіў лапкі» [2]:

Коцік басаногі
Па сняжку гуляў.
Адмарозіў лапкі
І заплакаў: — Мяў...
Што за дзіва гэта?
Трэба бегчы ў дом:
Снег такі халодны,
А пячэ агнём...

— Якія пачуцці выклікаюць у вас гэтыя вершы? *(Радасць. Сум.)* Чаму? Як мы разумеем, што адчуваюць іншыя людзі? Якія эмоцыі могуць зведваць людзі?

### Гульня «Перадай пачуццё»

Дзеці садзяцца ў кола і заплюшчваюць вочы. Выхавальнік пачынае гульню: дакранаецца да каго-небудзь з дзяцей, тое

расплюшчвае вочы. Педагог паказвае з дапамогай мімікі ці пантамімікі (пры неабходнасці) якое-небудзь пачуццё. (Можна таксама паказаць малюнак чалавека ў пэўным эмацыянальным стане.) Дзіця ківае галавой, дакранаецца да гульца, які сядзіць побач, і паказвае яму такое ж пачуццё. Астатнія дзеці працягваюць сядзець з заплюшчанымі вачамі — чакаюць, пакуль чарга дойдзе да іх. Калі круг будзе пройдзены, параўноўваецца мімічнае адлюстраванне пачуцця ў першага і апошняга ўдзельнікаў гульні, а таксама супастаўляюцца назвы пачуццяў.

46 Дамалюйце твары людзей: пакажыце на іх радасць, сум, здзіўленне, злосць. Раскажыце, чаму ў чалавека можа быць той ці іншы выраз твару.

***Гульня «Раскажы гісторыю»**

**В.:** Раскажыце самы смешны (вясёлы) выпадак з вашага жыцця. Што вы рабілі, калі вам было весела? *(Дзеці расказваюць па чарзе.)*

— Раскажыце самы сумны выпадак са свайго жыцця. Што вы рабілі, калі вам было сумна?

***Гульня «Паўтары фразу, перадаючы голасам розныя эмоцыі»**

**В.:** Зараз мы з вамі пагуляем. Я буду называць фразу, а вы павінны будзеце паўтарыць яе, перадаючы голасам розныя эмоцыі (радасць, сум, злосць, спалох). *(Сёння клубніцы паспелі. Я іду на навагодняе свята. Заўтрашні спектакль адменены. І г. д.)* Выхавальнік дае кожнаму дзіцяці папяровую талерку і прапаноўвае зрабіць маску пачуццяў (з адтулінамі для вачэй і вяровачкамі па баках (каб было зручна надзяваць)). Варта звярнуць увагу дзяцей на прарысоўку броваў і вуснаў пры перадачы эмоцыі на масцы пачуццяў. Дзеці па чарзе паказваюць маскі адно аднаму і адгадваюць эмоцыі.

# Занятк і 40

## ЭМОЦЫІ: МАЕ І ІНШЫХ ЛЮДЗЕЙ

***Задачы:***

- развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго «я», асаблівасцей іншых людзей; фарміраваць здольнасць да спагады, пазнання свайго ўнутранага свету, уяўлення пра адэкватныя мадэлі зносін і паводзін; выхоўваць асобасныя якасці, навыкі і ўменні, якія з'яўляюцца залогам паспяховых зносін (добразычлівасць, эмпатыю і інш.);
- *развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго ўнутранага свету, аднагодак і дарослых; фарміраваць уяўленні пра статусна-ролевую мадэль паводзін, яе гібкасць, уменне выбіраць мадэль зносін і паводзін, адэкватную эмацыянальнаму і фізічнаму стану іншага чалавека; выхоўваць маральныя якасці і добразычлівае стаўленне да іншых людзей (аднагодак, дзяцей малодшага ўзросту, дарослых).

***Матэрыял:***

- вучэбны наглядны дапаможнік (ліст 59); рабочы сшытак (с. 47); мяч;
- *лісты паперы для вырабу кніжак-малышак; алоўкі; фарбы.

### ХОД ЗАНЯТКАЎ

59 Выхавальнік паказвае дзецям ілюстрацыі і нагадвае:

— На мінулых занятках мы гаварылі пра эмоцыі. Якія твары на малюнках?

#### Гульня «Замарозка»

Дзеці становяцца ў кола і перадаюць адно аднаму мяч. Выхавальнік уключае музыку. Калі музыка спыняецца, педагог паказвае картку з эмоцыяй. Дзіця, якое трымае мяч, павінна «замарозіцца»: паказаць з дапамогай мімікі эмоцыю, адлюстраваную на картцы.

**В.:** Закончыце сказы:

1. Я радуюся, калі…
2. Мама злуецца, калі…
3. Тата сумуе, калі…
4. Я бянтэжуся, калі…
5. Мама палохаецца, калі…
6. Я здзіўляюся, калі…

— Людзі па-рознаму праяўляюць свае эмоцыі. Я буду прапаноўваць розныя сітуацыі, а вам трэба будзе паказаць без слоў, як вы адрэагуеце на іх, і назваць пачуцці, якія зведаеце пры гэтым.

1. Вы сустракаеце гасцей у свой дзень нараджэння.
2. У вас разбіўся кубак.
3. Вы пайшлі ў цырк з мамай і татам.
4. На вас брэша сабака.
5. Мама не хоча купляць вам новую цацку.
6. З вашых рук вырваўся паветраны шарык і паляцеў.
7. Да вас у госці прыехала бабуля.

47 Разгледзьце малюнкі. Знайдзіце адрозненні паміж імі. Які настрой у клоўнаў? Размалюйце клоўна, які вам больш падабаецца.

*Выхавальнік чытае дзецям верш Я. Крупенькі «Цудоўны настрой» [2]:

У мяне настрой цудоўны:
Дожджык скача
Цёплы, спорны,
Клапатлівы і ласкавы,
Мые дрэвы, поіць травы.
Гром злуецца, дождж смяецца,
На маю кашулю льецца.
Я па вуліцы іду,
Наступаю на ваду,
На ваду ў лужынах,
Задаволен дужа я.
Сонейка купаецца,
Ветліва ўсміхаецца.
Я іду па вуліцы,
Сонейка — па небе.

Ліся, дождждык, на зямлю.
Ты зямлі патрэбен.

— Што такое настрой? Як ён можа мяняцца? Ці можа чалавек кіраваць сваімі пачуццямі? Ці ёсць правілы, якія дапамагаюць чалавеку праяўляць свае пачуцці, не прыцягваючы да сябе ўвагі іншых людзей?

Выхавальнік размяркоўвае дзяцей па 4 падгрупах і прапаноўвае стварыць кніжкі-малышкі з малюнкамі: «Калі радасна», «Калі сумна», «Калі страшна», «Калі крыўдна».

## Заняткі 41

### ДОБРЫЯ СПРАВЫ

***Задачы:***

- развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго «я», асаблівасцей іншых людзей; фарміраваць уяўленні пра сацыяльныя нормы ўзаемадзеяння з аднагодкамі, уменні праяўляць добразычлівасць, асобасныя якасці, ацэньваць свае ўчынкі, дзеянні з пазіцыі маральных норм; закладваць асновы маральных каштоўнасцей; фарміраваць уяўленне пра паняцці «дружба», «справядлівасць», «працавітасць» і інш.;
- *развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго ўнутранага свету, аднагодак і дарослых; фарміраваць жаданне і ўменні аказваць эмацыянальную падтрымку, праяўляць спагаду, садзейнічанне; кантраляваць і ацэньваць з дапамогай дарослага і самастойна свае паводзіны, а таксама паводзіны аднагодак у адпаведнасці з маральнымі каштоўнасцямі; выхоўваць маральныя якасці і добразычлівае стаўленне да іншых людзей (аднагодак, дзяцей малодшага ўзросту, дарослых).

***Матэрыял:***

- вучэбны наглядны дапаможнік (ліст 60); рабочы сшытак (с. 48);
- *мяч; ліст ватману (фармат А2); фарбы.

### ХОД ЗАНЯТКАЎ

Выхавальнік чытае дзецям верш В. Жуковіча «Свая дапамога» [10]:

У нашай хаце пацямнела,
Сонейка не бачу я:
Нечакана захварэла
Мамачка мая.

У яе тэмпература,
Цяжка мамачцы маёй.
І таблеткі, і мікстуру
Я прыношу ёй.

— Ці лякарства памагае?
— Памагае, галубок,
Мабыць, лёгкая такая
У цябе рука, сынок.

Я памыю сам пасуду
І вазоны ўсе палью.
Берагчы заўсёды буду
Мамачку маю.

У нашай хаце пасвятлела,
Сонейка заззяла ў ёй:
Палягчэла, палягчэла
Мамачцы маёй!

— Якія добрыя ўчынкі рабіў хлопчык для сваёй мамы? У адносінах да каго мы можам праяўляць дабрыню? *(Да людзей, жывёл, раслін.)* Якія добрыя справы вы рабілі? Назавіце ветлівыя словы, якія добры чалавек выкарыстоўвае ў сваім маўленні.

**Гульня «Выканай такі рух, калі ласка»**

Дзецi становяцца ў кола. Выхавальнік просіць выконваць пэўныя рухі, але толькі пасля таго, як ён прамовіць «чарадзейнае слова» («паскачыце на аднойназе, калі ласка»; «падыміце рукі ўгору» і г. д.).

60 Выхавальнік паказвае дзецям ілюстрацыі:

— Разгледзьце малюнкі. Якія добрыя справы робяць дзеці? *(Хлопчык корміць птушак зімой; хлопчык дапамагае*

*падняцца дзяўчынцы, якая ўпала з веласіпеда; дзяўчынка дапамагае маці выцiраць посуд; дзяўчынка дапамагае малодшаму брату апранацца; дзеці прыбіраюць у сваім пакоі; хлопчык дапамагае бабулі сабраць яблыкі.)* Якімі словамі можна назваць чалавека, які здзяйсняе добрыя ўчынкі? *(Добрасардэчны, дабрадушны, добразычлівы.)*

Выхавальнік чытае дзецям беларускую народную казку «Лісіца і журавель» [2]:

Сустрэла лісіца жураўля.

— Кумок-галубок, прыходзь да мяне ў госці!

— Добра, — кажа журавель, — прыйду.

Наварыла лісіца рэдзенькага супу, наліла ў талерку. Журавель стукаў, стукаў дзюбай — так і не здолеў паесці. Падзякаваў ён лісіцы і пайшоў.

Праз пэўны час паклікаў лісіцу да сябе. Нагатаваў усяго, у вялікую бутэльку накідаў і частуе. Хадзіла лісіца, хадзіла кругом бутэлькі, каб хоць паспрабаваць, ды нічога не атрымалася. Раззлавалася яна на жураўля, пасварылася з ім і пайшла дадому. Так іх дружба і прапала...

— Як вы думаеце, чаму нас вучыць гэта казка? *(Калі мы хочам, каб людзі нас любілі, то трэба ставіцца да іх гэтак жа. Неабходна паводзіць сябе так, як мы хочам, каб іншыя людзі паводзілі сябе ў адносінах да нас.)* Ёсць такія словы: «Спяшайцеся рабіць дабро». Як вы думаеце, чаму трэба спяшацца? Куды можна спазніцца? А вам даводзілася шкадаваць аб тым, што не зрабілі добрую справу?

— Я буду называць прыказкі і прымаўкі пра дабрыню, а вам трэба будзе закончыць іх і растлумачыць.

1. Рабі дабро і чакай... *(дабра)*.
2. Ад дабра дабра не... *(шукай)*.
3. Свет не без добрых... *(людзей)*.
4. Добры чалавек і сабаку дражніць... *(не будзе)*.
5. Добрага ніколі не... *(замнога)*.

48 Гэта кветка добрых спраў. Намалюйце ў кружку сваіх сваякоў, блізкіх, сяброў (на выбар). Раскажыце, якую добрую справу вы для іх зробіце. Расфарбуйце пялёсткі.

***Гульня «Стужачка добрых слоў»**

Дзеці стаяць у коле, перадаюць адно аднаму мяч і прамаўляюць па чарзе «добрыя» словы. Той, хто не можа назваць слова, выбывае з гульні.

Выхавальнік чытае дзецям верш І. Муравейкі «Рабіць дабро» [6]:

Сеў мядзведзь на пень гарбаты,
Што быў крэслам для яго,
Выпіў конаўку гарбаты
З залацістым пірагом.

Узяў рыдлёўку і вядро
І пайшоў рабіць дабро.
Перш ён зайцу-слабаручку
Моркву выкапаў і бручку.

Зазірнуў і да баброў,
Да сваіх малых сяброў,
І пачаў дапамагаць
Ім запруду будаваць.

Адпачыў і зноў наперад:
Трэба шлях лясны праверыць.
Ён ішоў гаспадаром,
А не бесклапотна клыпаў.

Знёс з дарогі буралом
І калдобіны засыпаў.

А вярнуўшыся дадому,
Сеў на крэсла — пень гарбаты.
З'еў усмак пірог мядовы,
Выпіў конаўку гарбаты.

Пазяхнуў: «Пайду ў цянёк
І прылягу на бачок,
Болей сілы каб набрацца,
Бо яшчэ чакае праца».

— Як вы думаеце, чаму верш так называецца? Якія добрыя справы рабілі вы?

***Гульня «Што ты зробіш?»**

**В.:** Уявіце наступныя сітуацыі. Падумайце, што б зрабілі вы.

1. Да нас у групу прыйшла новая дзяўчынка. Яна ціха сядзіць у крэсле, ні з кім не гуляе.

2. Хлопчыкі палохаюць кацяня.

3. Маці прыйшла стомленая з працы.

4. Твая сястрычка ўпала, разбіла каленку.

*Выхавальнік прапаноўвае намаляваць калектыўны малюнак на тэму «Якога колеру дабрыня?».

## Заняткі 42

### САПРАЎДНЫ СЯБАР

***Задачы:***

- развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго «я», асаблівасцей іншых людзей; пашыраць уяўленні пра сацыяльныя нормы ўзаемадзеяння з аднагодкамі; фарміраваць уменне праяўляць добразычлівасць, спагаду; садзейнічаць самастойнаму праяўленню асобасных якасцей, учынкаў, ацэньваць іх з пазіцыі маральных норм; закладваць асновы маральных каштоўнасцей: фарміраваць уяўленне пра паняцці «дружба», «справядлівасць»;
- *развіваць схільнасць да аказання эмацыянальнай падтрымкі, садзейнічання іншаму чалавеку на аснове атаясамлівання свайго «я» з ім; замацоўваць уменні выбіраць мадэль зносін і паводзін, адэкватную эмацыянальнаму і фізічнаму стану іншага чалавека, дзейнічаць з пазіцыі сацыяльна-маральных арыенціраў і пачуццяў; выхоўваць маральныя якасці і добразычлівае стаўленне да іншых людзей (аднагодак, дзяцей малодшага ўзросту, дарослых).

***Матэрыял:***

- вучэбны наглядны дапаможнік (ліст 61); рабочы сшытак (с. 49); мяч; 6 канвертаў з разрэзанымі сюжэтнымі малюнкамі (старэйшыя дзяўчынкі гуляюць з лялькай, а малодшая дзяўчынка стаіць побач і плача; хлопчыкі разам малююць; дзяўчынкі разам катаюцца з горкі на санках; хлопчык есць персік, а дзяўчынка стаіць побач

і глядзіць на яго; дзеці запускаюць паветранага змея; дзеці купаюцца ў рацэ); аўдыёзапіс песні «Сапраўдны сябар» (сл. М. Пляцкоўскага, муз. Б. Савельева);

- *ліст паперы для кожнага дзіцяці; алоўкі; фарбы.

ХОД ЗАНЯТКАЎ

Выхавальнік прапаноўвае дзецям праслухаць песню «Сапраўдны сябар»:

— Пра што гэта песня? *(Пра дружбу, сябра.)* Як вы думаеце, што такое дружба? *(Калі дзеці гуляюць разам, не сварацца, не шкадуюць цацак адно аднаму, не крыўдзяцца, даяраюць адно аднаму і г. д.)*

**Гульня «Мой лепшы сябар»**

Дзеці становяцца ў кола, пачынаюць перадаваць адно аднаму мяч і называць імёны сваіх лепшых сяброў.

**В.:** Раскажыце пра свайго сябра. *(Дзеці расказваюць (па жаданні).)* А сябры сварацца? Як можна паміріцца пасля сваркі? *(Папрасіць прабачэння, абняцца, паміріцца «пальчыкамі» і г. д.)*

61 **Гульня «Мазаіка»**

Выхавальнік размяркоўвае дзяцей па 6 падгрупах. Кожнай падгрупе даецца канверт з разрэзаным сюжэтным малюнкам (старэйшыя дзяўчынкі гуляюць з лялькай, а малодшая дзяўчынка стаіць побач і плача; хлопчыкі разам малююць; дзяўчынкі разам катаюцца з горкі на санках; хлопчык есць персік, а дзяўчынка стаіць побач і глядзіць на яго; дзеці запускаюць паветранага змея; дзеці купаюцца ў рацэ). Дзецям трэба скласці малюнак з фрагментаў і адказаць, хто на гэтым малюнку сапраўдны сябар, а хто не і чаму.

Выхавальнік прапаноўвае закончыць прыказкі і прымаўкі пра дружбу:

1. Дружба мацнейшая за каменныя... *(сцены)*.
2. Чалавек без сябра што ежа... *(без солі)*.
3. Новых сяброў набывай, а старых... *(не забывай)*.
4. Хто сяброў мае, той бяды... *(не знае)*.
5. Дрэва трымаецца каранямі, а чалавек... *(сябрамі)*.

— Што трэба рабіць для таго, каб мець сапраўдных сяброў? Падумайце, што зрабіў бы сапраўдны сябар у наступных сітуацыях:

1. Каця і Люба сяброўкі. Яны пайшлі гуляць у парк. Каця ўзяла з сабой парасон, а Люба — не. Раптам пачаўся дождж. Што зробіць Каця?

2. Пеця і Вася сябры. Яны прыйшлі ў дзіцячы сад. Вася прынёс з сабой з дому новую машынку. Што зробіць Вася?

3. Аніна сяброўка Оля захварэла і не прыйшла ў дзіцячы сад. Што павінна зрабіць Аня?

49 Здагадайцеся, да якога апавядання выканана ілюстрацыя. *(Да апавядання Л. М. Талстога «Леў і сабачка».)* Пра што гэта апавяданне? Пра дружбу паміж кім? Расфарбуйце малюнак.

*Выхавальнік чытае дзецям казку В. Гурскага «Верныя сябры» [10].

— Чаму так называецца казка? Як сябры дапамагалі адно аднаму ў барацьбе з ваўком?

Выхавальнік прапаноўвае дзецям прыдумаць і намаляваць узнагароду «Сапраўдны сябар».

## Заняткі 43

### Я — ДОБРЫ СЯБАР

***Задачы:***

- развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго «я», асаблівасцей іншых людзей; удакладняць уяўленні пра сацыяльныя нормы ўзаемадзеяння з аднагодкамі; закладваць асновы маральных каштоўнасцей: фарміраваць уяўленне пра паняцці «дружба», «справядлівасць»;
- *развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго ўнутранага свету, аднагодак і дарослых; замацоўваць уменні выбіраць мадэль зносін і паводзін, адэкватную эмацыянальнаму і фізічнаму стану іншага чалавека, дзейнічаць з пазіцыі сацыяльна-маральных арыенціраў і пачуццяў;

выхоўваць маральныя якасці і добразычлівае стаўленне да іншых людзей (аднагодак, дзяцей малодшага ўзросту, дарослых).

***Матэрыял:***

- вучэбны наглядны дапаможнік (ліст 62); рабочы сшытак (с. 50);
- *лісты паперы (на кожнае дзіця); алоўкі.

***Папярэдняя работа:*** чытанне рускай народнай казкі «Крылаты, махнаты ды масляны».

ХОД ЗАНЯТКАЎ

Выхавальнік чытае дзецям верш А. Масцеравай «Слёзы Рыгоркі» [6]:

— Як жа прыкра, як жа горка! —
Тужыць папугай Рыгорка. —
Кепска, сумна ў нашай хаце:
З брацікам не дружыць брацік!

Данік з Дзімкам моцна б'юцца,
Аж чубы ў братоў трасуцца.
І ніхто не вінаваты —
Хоць ляці хутчэй ты з хаты!

Папугайчык спахмурнеў,
У маркоце змізарнеў,
Не спяваў і не лятаў,
Толькі слёзкі выціраў...

Так убачылі блазноты,
Да чаго вядзе ахвота
Біцца, абзываць, сварыцца,
Як чужыя людзі быццам.

Перасталі лезці ў бойку,
Пачалі гуляць з Рыгоркам,
Разам бегаць па падворку,
Коўзацца на санках з горкі.

Сталі добрымі сябрамі
На здзіўленне тату, маці...
Папугайчык акрыяў
Гучна ўсім ён заспяваў!

— Чаму пасварыліся хлопчыкі? А як яны памірыліся?

— А ў вас здараліся сваркі з сябрамі? Сваркі бываюць ва ўсіх. Сварацца многія людзі, але па-рознаму: называюць адно аднаго крыўднымі словамі, злуюцца. Што вы адчувалі падчас сваркі? *(Сорам, злосць, віну, крыўду.)* Як вы мірыліся?

62 Выхавальнік паказвае дзецям ілюстрацыі:

— Разгледзьце малюнкі. Што адбылося з дзецьмі? *(У аўтобусе дзяўчынка штурхнула хлопчыка; дзяўчынка адабрала ў іншай дзяўчынкі ляльку; вецер сарваў з галавы хлопчыка кепку, а дзяўчынка глядзіць і смяецца; хлопчык адабраў у дзяўчынкі веласіпед, дзяўчынка плача.)* Што дзецям трэба зрабіць, каб не пасварыцца? *(Трэба папрасіць прабачэння.)*

— Давайце прыдумаем правілы, якія дапамогуць нам жыць у групе мірна. *(Трэба дапамагаць і саступаць адно аднаму; не зайздросціць, калі ў кагосьці штосьці атрымліваецца лепш.)*

— Як можна папрасіць прабачэння? *(«Прабач, калі ласка, я ненаўмысна»; «Прабач, калі ласка, я не хацеў»; «Прабач! Мне шкада, што я так зрабіў».)* Калі просяць прабачэння, то глядзяць у вочы чалавеку, якога пакрыўдзілі.

**Гульня «Даруй мне»**

Дзеці дзеляцца на пары, просяць адно ў аднаго прабачэння і па чарзе адказваюць на яго.

**В.:** Чалавек, у якога вы просіце прабачэння, бачыць, што вам няёмка. Ці было вам шкада чалавека, які просіць прабачэння? Чаму? *(Ён адчувае сорам, няёмкасць; яму дрэнна.)* Калі чалавеку даравалі, яму становіцца лёгка, весела. Лёгка і весела становіцца і таму, хто дараваў, бо ён падзяліўся дабрынёй.

— А як можна пашкадаваць, суцешыць іншага чалавека? *(Абняць, пагладзіць па галаве.)* Пакажыце, як вас шкадуе мама.

50 Здагадайцеся, да якой казкі выканаены малюнак. *(Да рускай народнай казкі «Крылаты, махнаты ды масляны».)* Што атрымалася, калі героі памяняліся хатнімі абавязкамі?

Расфарбуйце малюнак.

*Выхавальнік размяркоўвае дзяцей на 2 каманды і прапаноўвае кожнай камандзе паказаць з дапамогай мімікі і пантамімікі радасць (напрыклад, ад атрымання доўгачаканага падарунка): засмяяцца, пляснуць у далоні, абняць, станцаваць, заспяваць, перадаць эмоцыю словамі і г. д.

Далей педагог робіць выснову: пачуццё радасці можна праяўляць рознымі спосабамі, трэба толькі выбраць той, што падыходзіць да канкрэтнай сітуацыі.

Выхавальнік прапаноўвае кожнаму дзіцяці намаляваць аўтапартрэт на тэму «Я радуюся падарунку сябра». Каб маляваць было лягчэй, дзецям прапаноўваецца паглядзець на сябе ў люстэрка.

## Заняткі 44

### ДОБРЫЯ ЎЧЫНКІ

***Задачы:***

- развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго «я», асаблівасцей іншых людзей; замацоўваць уяўленні пра сацыяльныя нормы ўзаемадзеяння з аднагодкамі; фарміраваць уменне прымяняць з дапамогай дарослага і самастойна спосабы вырашэння канфліктаў з аднагодкамі мірным шляхам; закладваць асновы маральных каштоўнасцей: фарміраваць уяўленне пра паняцці «сяброўства», «справядлівасць»;
- *развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго ўнутранага свету, іншых людзей (аднагодак і дарослых); фарміраваць уменне праяўляць гібкасць у паводзінах з дапамогай дарослага і самастойна; выхоўваць імкненне да паразумення і суперажывання блізкім, аднагодкам.

***Матэрыял:***

- вучэбны наглядны дапаможнік (ліст 62); рабочы сшытак (с. 51);
- *лялька; крэсла; лісты паперы (на кожнае дзіця); алоўкі.

## ХОД ЗАНЯТКАЎ

62 Выхавальнік паказвае дзецям ілюстрацыі:

— Мы жывём дружна, але бываюць сітуацыі, калі мы сварымся. Паспрабуйце ўявіць мірнае завяршэнне гісторый, што адбыліся з дзецьмі. Паглядзіце на малюнак. Што вы бачыце? *(Дзяўчынка ў аўтобусе штурхнула хлопчыка.)* Аднойчы дзяўчынка Маша ехала ў аўтобусе ў госці да бабулі. Яна заглядзелася на дрэвы за акном і ледзь не праехала свой прыпынак. Маша ўскочыла і стала хутка рухацца да выхаду. Дзяўчынка так спяшалася, што штурхнула хлопчыка Пецю. Давайце паспрабуем уявіць гэту сітуацыю і прыдумаем гутарку Машы і Пеці. Што скажа Пеця? Што адкажа Маша? Што адбудзецца далей? Чым скончыцца гэта гісторыя?

— Што вы бачыце на гэтым малюнку? *(Дзяўчынка адабрала ў іншай дзяўчынкі ляльку.)* Аднойчы маці купіла Тане прыгожую ляльку. Таня ўзяла яе з сабой у дзіцячы сад. Саша таксама захацела пагуляць з прыгожай лялькай. Яна падбегла да Тані і выхапіла ляльку ў яе з рук. Што скажа Таня? Што адкажа Саша? Што адбудзецца далей? Чым скончыцца гэта гісторыя?

**Гульня «Кола дружбы»**

Дзеці і выхавальнік бяруцца за рукі і ўтвараюць кола. Педагог паведамляе, што трэба рабіць, і звяртае ўвагу выхаванцаў на галоўную ўмову: нельга разрываць кола. («Утвараем кола: самае вялікае, самае маленькае; самае высокае (скачам), самае нізкае (прысаджваемся), самае ўсмешлівае (усміхаемся), самае вясёлае (смяёмся)» і г. д.).

— Пра што нам расказвае гэты малюнак? *(З галавы хлопчыка ветрам сарвала кепку, а дзяўчынка глядзіць і смяецца.)* Аднойчы Коля пайшоў гуляць на вуліцу. Моцны вецер сарваў з галавы хлопчыка кепку. Коля разгубіўся, а Каця пачала гучна смяяцца. Што скажа Коля? Што адкажа Каця? Што адбудзецца далей? Чым скончыцца гэта гісторыя?

— Прыдумайце расказ па гэтым малюнку *(хлопчык адабраў у дзяўчынкі веласіпед, дзяўчынка плача)*.

— Успомніце правілы, якія дапамагаюць нам жыць дружна.

51 Раскажыце, што вы бачыце на малюнках. Назавіце добры і дрэнны ўчынкі дзяцей. Расфарбуйце малюнак, на якім паказана дзіця, якое здзяйсняе добры ўчынак.

***В.**: Як можна паказаць сваё стаўленне да чалавека?

Пасля адказаў дзяцей выхавальнік садзіць у крэсла ляльку:

— Уявіце, што гэта чалавек. Вы будзеце па чарзе падыходзіць да лялькі і паказваць жэстамі, як вы ставіцеся да гэтага чалавека. Астатнія павінны будуць зразумець, што абазначаюць жэсты. Толькі памятайце, што не ўсім людзям падабаецца, калі іх гладзяць па галаве або паляпваюць па плячы, таму лепш спытацца ў чалавека, ці не пакрыўдзяць яго вашы дзеянні.

Выхавальнік прапаноўвае дзецям намаляваць іх уласныя добрыя ўчынкі (па адным) і расказаць пра іх.

## Заняткі 45

### ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ ДЗЯЦЕЙ

***Задачы:***

- развіваць патрэбнасць у пазнанні свайго «я»; фарміраваць першасныя ўяўленні аб правах і абавязках; фарміраваць уменне наладжваць адносіны з іншымі людзьмі на аснове ведання сваіх правоў і абавязкаў з дапамогай дарослага і самастойна; выхоўваць маральныя і эстэтычныя пачуцці;
- *развіваць уменне разважаць; замацоўваць уяўленні аб правах і абавязках дзяцей; практыкаваць у спосабах наладжвання адносін з іншымі людзьмі на аснове ведання сваіх правоў і абавязкаў; выхоўваць маральныя якасці і добразычлівае стаўленне да іншых людзей (аднагодак, дзяцей малодшага ўзросту, дарослых).

***Матэрыял:***

- вучэбны наглядны дапаможнік (лісты 63—64); рабочы сшытак (с. 52); мяч;
- *мяч; лісты паперы (на кожнае дзіця); алоўкі.

ХОД ЗАНЯТКАЎ

63—64 Выхавальнік паказвае дзецям ілюстрацыі:

— Разгледзьце малюнкі. Каго вы бачыце на іх? *(Дзяцей.)* Які ў дзяцей настрой? *(Нехта вясёлы, нехта сумны.)* Чаму дзеці вясёлыя? Чаму дзеці сумныя? Што мы можам зрабіць, каб ім стала весела?

**В.:** Дзеці на малюнках шчаслівыя, таму што ў іх ёсць дом, сям'я, яны могуць вучыцца, лячыцца, калі захварэюць. Такія магчымасці называюцца правамі. Правы ахоўваюцца дзяржавай. Дзеці ва ўсім свеце маюць правы. У кожнага дзіцяці ёсць права быць любімым, мець дом, хадзіць у школу, быць здаровым, жыць у бяспецы, мірным асяроддзі. Часам правы дзяцей парушаюцца. Напрыклад, у тым выпадку, калі дзіця пазбаўляецца бацькоў, дома; страчвае магчымасць вучыцца з-за недахопу школ, кніг, настаўнікаў; вымушана выконваць цяжкую працу; не можа атрымаць медыцынскую дапамогу з-за адсутнасці бальніц.

**Гульня «Што здарылася б, калі...»**

Выхавальнік прапаноўвае дзецям падумаць і адказаць на пытанні:

1. Што здарылася б, калі б у вас не было дома?
2. Што здарылася б, калі б у вас не было сяброў?
3. Што здарылася б, калі б не было міліцыі (пажарных)?
4. Што здарылася б, калі б не было ўрачоў і лякарстваў?
5. Што здарылася б, калі б у вас не было сям'і?

**В.:** Падумайце пра тое, што робіць вас шчаслівымі. (Выхавальнік прапаноўвае дзецям перадаваць адно аднаму мяч па крузе і выказвацца па чарзе.)

52 Кожнае дзіця мае права жыць у сям'і. Ніхто не мае права пазбаўляць яго сям'і. Намалюйце сябе і сваіх сваякоў. Раскажыце пра сваю сям'ю.

*Выхавальнік чытае верш М. Мятліцкага «Абібок» [6]:

— Хто такі ён — абібок?
— Гэта, пэўна, Калабок.
Ён у хмурыя лясы
Збег ад бабкі да лісы.
І, круцель, вяртун такі,
Сам сабе аббіў бакі, —
Адказаў так Ігарок
На пытанне мамы.
Хоць у ложку абібок
І ляжаў той самы.

— Як вы лічыце, ці ёсць абавязкі ў Ігарка? Чаму маці называе яго абібокам? Што такое абавязкі? *(Пасільная праца, якую дзеці могуць выконваць дома і ў дзіцячым садзе.)*

***Гульня «Мае абавязкі»**

Дзеці перадаюць адно аднаму мяч па крузе і па чарзе расказваюць пра свае абавязкі дома ці ў дзіцячым садзе.

— Якія абавязкі для вас прыемныя, а якія не?

***Гульня «Будзь уважлівы»**

Дзеці ўтвараюць кола. Выхавальнік знаходзіцца ў цэнтры, нагадвае пра тое, што ў кожнага дзіцяці ёсць правы і абавязкі, кідае выхаванцам па чарзе мяч і прамаўляе адну з фраз: «Я маю права на...», «У мяне ёсць абавязак...». Дзеці ловяць мяч і адказваюць.

*Выхавальнік прапаноўвае дзецям намаляваць жывёлу ці расліну, якіх яны абавязаны даглядаць дома, а затым скласці расказ на тэму «Мае абавязкі па доглядзе жывёлы (расліны)».